№ 42 (352) 14 лістапада 2003 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы

**Дзёньнік Славаміра Адамовіча**
«30 траўня мы атакавалі гэтае чортава пасольства...»
старонка 14–15

**Час паразытаў**
Пагоня за залатымі падрадамі на рэканструкцыю сталіцы.
старонка 5

**Трохсотая «Аіда»**
Пастаноўка Александроўскай 50 гадоў на сцэне.
старонка 13



# Пацёмкінская сталіца

Вялікія перамены ў вобразе беларускае сталіцы навідавоку. Самай яскравай зьяваю апошняга часу стала рэканструкцыя тэрыторыі паміж Верхнім горадам і Замчышчам. Увесь верасень і кастрычнік там шчыравала тэхніка: раўлі бульдозэры, езьдзілі туды-сюды грузавікі. Праз увесь пагорак пралегла даўжэзная лесьвіца, зьявіліся лавачкі, ліхтары. Калісь ад Сьвятадухавага сабору да сёньняшняе Нямігі спускалася пакручастая Казьмадзям’янаўская вуліца — пры саветах вул.Дзям’яна Беднага. Дакладней, вулічка — пятнаццаць камянічак, стракацень фасадаў. Хто быў у Празе ды бачыў Злату улічку пры саборы Сьвятога Віта, можа сабе ўявіць. Паваенныя рэканструкцыі пакінулі ад беднай вуліцы адзін-адзіны будынак. Добра помніцца тая апошняя старасьвецкая камяніца. За пару гадоў да зносу яе капітальна адрамантавалі й аддалі мастакам пад майстэрні. Зьнесьлі. Хоць дзяўблі гэты дом ці ня з тыдзень. Не паддаваліся старыя муры. Пасьля побач з тым месцам азеўрыўся гіганцкі катляван пад мэтро. І вось цяпер ізноў новабудоўля. Але на аднаўленьне Казьмадзям’янаўскай не падобна.

Старонка 3.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

## Апазыцыйная кааліцыя займела назву

**Кааліцыя апазыцыйных партыяў зацьвердзіла сваю працоўную назву — «пяць з плюсам»,** пашырылася і пазеленела (за кошт далучэньня Беларускай партыі зялёных). У сьнежні мае паўстаць адзіны сьпіс кандыдатаў у дэпутаты. Тым часам улады адмовіліся зарэгістраваць Асамблею няўрадавых арганізацый Беларусі.

## Гарадзенцы за Быкава

**517 гарадзенцаў падпісалі зварот з прапановай пераназваць бульвар Ленінскага Камсамолу ў бульвар Быкава.** 417 зь іх — жыхары бульвару. Адпаведныя звароты да ўладаў падрыхтаваў дэпутат гарсавету Сяргей Антусевіч.

## Аўстрыйскі візыт Мясьніковіча

**Кіраўнік Акадэміі навук Міхаіл Мясьніковіч, які апошнім часам выконвае спэцыяльныя даручэньні Аляксандра Лукашэнкі,** 9—11 лістапада наведаў Аўстрыю. Сярод іншага, у краіне над Дунаем ён сустракаўся з кіраўнікамі тэлекамунікацыйных кампаній.

## Казлоў замест Шніпа

**Новым рэдактарам газэты «Літаратура і мастацтва» прызначаны не Ўладзімер Глушакоў, як меркавалася, а Анатоль Казлоў,** празаік, што раней працаваў у часопісе «Полымя». Загад ужо падпісаны. Прычыны адстаўкі Віктара Шніпа не абвешчаныя. Зь «ЛіМу» па ўласным жаданьні сышла Людміла Рублеўская, В.Шніп застаецца адказным сакратаром газэты.

СМ

# Аксана Новікава: «Ёсьць іншая барацьба»

**Правамерна было б казаць пра загадку Аксаны Новікавай, адзіночкі, якая жыве і змагаецца сама, убаку ад партыяў і рухаў. Кантраст паміж мілай усьмешлівай Новікавай-суразмоўцай і бескампраміснай, эмацыйнай да гістэрыкі Новікавай-барацьбіткай кідаецца ў вочы. Карэспандэнтка «НН» у гутарцы з спн.Аксанай паспрабавала скласьці разам гэтыя «дзьве душы». Размова пачалася, вядома, з палітыкі.**

**Аксана Новікава:** Любая сучасная дзяржава мусіць імкнуцца да дэмакратызацыі й выкананьня Пакту аб правох чалавека, які Беларусь ратыфікавала. А калі ў краіне парушаюцца правы хоць бы аднае групы насельніцтва і ўрад не нясе за гэта пакараньня, дзяржава пачынае наступ на людзей: а каго можна яшчэ прышчаміць? Мяне гэта абурае.

**«НН»: Лягічныя й нармальныя пытаньні, іх тут разумеюць мільёны людзей. Але сядзяць і маўчаць. Чаму менавіта Вы за ўсіх палезьлі на ражон?**

**А.Н.:** Гэта са мной не адразу пачалося. Першым крокам па гэтай дарозе быў учынак Пазьняка, калі ён паклаў камунізму ў 1991 г. вянок з калючага дроту. Мая першая сьвякруха, Сьвятлана Новікава, распавядала мне пра гэта. Яна вельмі сябравала з Пазьняком. Незвычайная асоба. Бліскучы матэматык. На жаль, вядомая больш за мяжою, чым тут. Яна хацела абараняць сваю дысэртацыю з матэматыкі толькі па-беларуску. Працавала ў Акадэміі навук, была блізкая да асяродку супрацiву.

Працяг на старонцы 7.

# Сярэднія заробкі і пэнсіі ва Ўсходняй Эўропе

Сярэдняя пэнсія ў Польшчы ў 2001 г. складала 285 даляраў, у Чэхіі — 231, у Вугоршчыне — 172, у Славаччыне — 143, у Літве — 99. Параўнальныя зьвесткі на гэтую тэму апублікавала ў панядзелак бюро «Эўрастат». Сярэдні заробак складаў у Польшчы 646 даляраў, у Чэхіі — 506, у Вугоршчыне — 464, у Славаччыне — 329, у Літве — 315. Сярод краінаў — кандыдатак на ўваход у Эўразьвяз найбольшыя пэнсіі на Мальце (925 даляраў), а заробкі — на Кіпры (1786 даляраў). Найменшыя заробкі й пэнсіі сярод такіх краінаў адзначаюцца ў Баўгарыі (141 і 54 даляры адпаведна).

У Беларусі на сёньня сярэдні заробак складае 138 даляраў, сярэдняя пэнсія — 47 даляраў. У Расеі гэтыя паказьнікі даходзяць усяго да 112 і 46 даляраў.

Улічваючы, што «Эўрастат» ня мае навейшых зьвестак, а апошнія два гады памеры пэнсіяў і заробкаў у краінах расьлі, на сёньня разрыў ва ўзроўні заробкаў між краінамі-кандыдаткамі, што ўзялі курс на Эўропу, і Беларусяй, што гэтыя гады інтэгравалася з Расеяй, будзе яшчэ большы.

**Зьвесткі «Эўрастату» (краіны-кандыдаткі), «Прыёрбанку» (Беларусь), «Gazeta.ru» (Расея)**






## Хто такі Алег Багуцкі

На гэтым тыдні шырокі розгалас у вузкіх палітычных колах выклікаў артыкул Алега Багуцкага, разьмешчаны ў Інтэрнэце і растыражаваны дзяржаўнай прэсай. Палітыкі абураліся прыёмамі, з дапамогаю якіх аўтар бэсьціць усе сілы, што склалі «дэмакратычную пяцёрку». Хто такі Багуцкі?

Ён кіраўнік прапагандысцкай камісіі Народнай грамады. Яму 35 гадоў, ён ураджэнец Полаччыны. У 1990 годзе быў дэпутатам полацкага гарсавету, але што цікава — пад іншым прозьвішчам! Багуцкім ён стаў, калі пераехаў у Менск. Па адукацыі Багуцкі гісторык. Кажуць, што ў пачатку 90-х напісаў кнігу з ганьбаваньнем Уніі, але ён сам гэты факт адмаўляе. У другой палове 90-х ён ужо ўзначальваў выканкам Беларускай сацыял-дэмакратычнай грамады. Станіслаў Шушкевіч яму давяраў, лічыў Багуцкага «даволі адукаваным чалавекам», які, аднак, так і не навучыўся дасканала гаварыць па-беларуску.

Былыя партыйныя паплечнікі Багуцкага згадваюць пра яго як пра «незразумелага чалавека». Падчас прэзыдэнцкіх выбараў 2001 г. Багуцкі працаваў у штабе Сініцына, які выступаў своеасаблівай карыкатурай на дэмакратычных кандыдатаў. А ўжо пры канцы 2001-га з скандалам сышоў у партыю Статкевіча, якога разгромна крытыкаваў трыма гадамі раней. Сыходзячы, Багуцкі падаў у Мінюст сьпіс з трохсот чалавек, якія нібыта разам зь ім выйшлі з БСДГ. Але падчас праверкі выявілася, што сышлі толькі сем чалавек. Зьвесткі на іншых, верагодна, былі ўзятыя з партыйнай кампутарнай базы. У сьпіс «незадаволеных» патрапіла нават жонка Шушкевіча, якая ў базе фігуравала пад іншым прозьвішчам, чаго ня ведаў падатчык.

Расказваюць, што «ў яго шмат злосьці на ўсіх і ўсё».

**АТ**

БТ ВАЧЫМА БЕЛАРУСА

## Зноскі і здольнікі

На БТ прынята наракаць: правінцыйнае, савецкае і ўвогуле вельмі мала беларускае. Можна было чакаць, што пасьля пахаладаньня ў дачыненьнях Пуціна і Лукашэнкі стаўленьне да ўсходняга суседа мусіла б стаць больш крытычным. Але ж не. Па-ранейшаму ў цэнтры ўвагі гледачоў АТН расейскае: выбары ў Расеі, візыты яе кіраўнікоў — і падаецца ўсё гэта менавіта з расейскага гледзішча. Так, камэнтаваць расейскія выбары на БТ запрашаюць А.Дугіна, які адводзіць Беларусі ролю аднае з цэнтральных правінцый Расеі. А тое, што Сыльвіё Бэрлюсконі падтрымаў дзеяньні расейскае ўлады ў Чачэніі і ў справе Хадаркоўскага, падаецца як значная перамога. Хоць Эўразьвяз тут з італьянскім прэм'ерам не пагадзіўся, і ўвогуле ён лічыцца фігурай скандальнай. Вялікая ўвага надаецца тлумачэньням карысьці ўсяму сьвету ад расейска-кітайскага хаўрусу.

Не забываюцца і пра савецкія атрыбуты. У передачы «Вакол плянэты» 8 лістапада (адтуль узятыя, дарэчы, і два папярэднія прыклады) вядучы доўга разважае аб сусьветным значэньні рэвалюцыі, калі «наш народ аказваў уплыў на ўсю сусьветную гісторыю» (зноў расеяцэнтрызм). Прыводзіць прыклад Францыі: там, маўляў, шануюць і свайго Напалеона, і свайго Рабэсп'ера. Напалеон — гутарка асобная. А вось Рабэсп'ер — постаць, якая ня вельмі карыстаецца прыхільнасьцю француза.

Приемна ўразіла перадача «Адкрыты архіў», прысьвечаная т.зв. «Пісьму беларускага народу вялікаму Сталіну». Тут можна шмат пра што даведацца. Пра тое, напрыклад, як марудна ішоў збор подпісаў і ўладам давялося скарачаць афіцыйную колькасьць падпісантаў з трох да двух мільёнаў. Як зьняволеным успаміналіся радкі пра чорнае мінулае, калі «на абед была нам лебяда», і людзі дзівіліся, як мала ўсё зьмянілася з тых часоў. Літаратуразнаўца Пятро Васючэнка лічыць, што гэты твор прызналі б сёньня постмадэрністы. Мастак Яўген Ціхановіч бачыць тут нацыянальную асаблівасьць беларусаў паказваць сябе і сваю краіну не экзотыкай, а творамі мастацтва. Ёсьць і проста гумарыстычныя выпадкі, зьвязаныя з завучваньнем гэтага твора на памяць.

У наступную суботу будзе працяг перадачы. Раю паглядзець яе.

**Усяслаў Шатэрнік**

ЛЕВЫМ ВОКАМ

## Матрыца-мама, Зіён-тата



У адпаведнасьці з «Матрыцай», апазыцыя ёсьць абавязковым экспэрымэнтальным элемэнтам сыстэмы.

Бум вакол выхаду апошняй «Матрыцы» адсунуў на задні плян нават спрадвечныя для беларускай праблемы — «Дзе дагнацца?» і «Дзе Ганчар?». Ці можна разглядаць кампутарную герыльню жыхароў Зіёну як беларускую мадэль палітычнага супраціву XXI ст.?

Вялікая ілюзія часьцяком уплывала на формы палітычнай барацьбы. Банда Баадэр-Майнгоф пачала чысьціць банкаўскія касы, нагледзеўшыся прыгодаў Боні і Клайда ды Фантамаса. Акрамя таго, сынэма — куцое іміджу палітыкаў. Клішэ беларускага нацыяналіста — вусач у вышыванай кашулі — быў зьлеплены савецкім кінэматографам. Калякін відавочна косіць пад героя карціны «Камуніст».

У Беларусі «Матрыца» прырэчаная мець большы, чым дзе ў сьвеце, палітычны рэзананс. Ідэю матрычнага рабства-быцьця запраграмаванай сьвядомасьці вельмі лёгка экстрапаляваць на беларускую рэчаіснасьць. Адныя толькі прагрузы запісваецца ў БРСМ выклікаюць асацыяцыю з прыстаўленымі да патыліцы датчыкамі і іншым інвэнтаром машыннага прыгнёту. Толькі самы тупы маладзевы апазыцыйны лідэр, агітуючы школяроў у паход на піва замест абавязковага прагляду «Настасьсі Слуцкай», міне вобразы кібэрінсургентаў.

Аднак не сьпяшайцеся гнуць лыжкі поглядам і скакаць з даху на дах. Калі прыгледзецца да існай мадэлі апазыцыі, выявіцца, што яна даўно змагаецца паводле запаветаў Морфэўса. Існуе лукашэнкаўская Матрыца, і існуюць апазыцыянэры. У сваёй цялеснай рэчаіснасьці яны «прапісаныя» на караблях (штаб-кватэрах) і ў калёніі Зіёне (Захад). Дэмакраты працуюць і, як антыматрычныя партызаны, знаходзяць нэафітаў ды прапануюць дзьве таблеткі: хочаш заставацца быдлам або стаць прадстаўніком эўрапейскай эліты — абраным?

Эўрапейская абранасьць разглядаецца як галоўны дэтэрмінант прыналежнасьці да апазыцыі, аднак яна пазбаўляе яе прадстаўнікоў «вольнага выбару». Гэта добра ілюструе гісторыя Пашы Севярынца. На пачатку паліткар'еры лідэра «Маладога фронту» яго паводзіны падаваліся як праява якасьцяў звычайнага чалавека, іншымі словамі — «матрычнасьці». Сёньня сваёй пылкай верай беларускі Нэо амаль перамог рэчаіснасьць-матрыцу.

Між тым не абранасьць, а матрыца вызвалае сьмяротныя грахі і чалавечыя пачуцьці. Прыгадаем эпізоды фільму: славалюбства і залежнасьць ад алькаголю (Сайфэр), злосьць (паліцэйскія, якія ненавідзяць агентаў), нават вострае пачуцьцё прыватнай уласнасьці — эмацыйная рэакцыя Мінака, у якога Нэо стырыў мабільнік, — усё гэта дае якраз матрыца. А партызаны-апазыцыянэры чым бліжэйшыя да статусу поўнай абранасьці, тым больш ператтвараюцца ў чыстыя функцыі сюжэту супрацьстаяньня матрыцы і апазыцыі. Дарэчы, у адпаведнасьці з «Матрыцай-2», апазыцыя ёсьць абавязковым экспэрымэнтальным элемэнтам сыстэмы.

Прапаную шукаць кінапрататып мадэлі паўстаньня ў іншых блякбастэрах. Кажуць, што ў Галівудзе здымаюць другую частку «Хто падставіў труса Роджэра».

**Лёлік Ушкін,**
шалёны санкюлёт

У ПАЛІТЫЦЫ І КАЛЯ ПАЛІТЫКІ

Газэта «Салідарнасць» надрукавала сэнсацыйную інфармацыю: расейскае кіраўніцтва распрацоўвае плян адхіленьня Аляксандра Лукашэнкі ад улады восеньню 2004 г. Пры гэтым адзначаецца, што зьвесткі былі атрыманыя ад «інфармаванай крыніцы, блізкай да кіраўніцтва Расеі». Выпадкова ці не, але праз два дні на Гомельшчыне, у Жыткавічах, Лукашэнка даў «адказ Чэмбэрлену» — загаварыў пра магчымасьць свайго ўдзелу ў будучых прэзыдэнцкіх выбарах. Паабяцаў, што спытаецца ў народу, ці хоча ён гэтага. Такі вось празрысты намёк на рэфэрэндум, пэрспэктывай якога Лукашэнка рэгулярна палохае апазыцыю і дэмакратычны Захад, а цяпер яшчэ і Расею.

У Гомелі ж сябры АГП 7 лістапада наладзілі на вуліцы грамадзкае галасаваньне, каб даведацца, як грамадзяне ставяцца да трэцяга тэрміну прэзыдэнцтва. Як сьцьвярджаюць арганізатары, за паўтары гадзіны прагаласавалі 2172 чалавекі, зь якіх 1947 (89,6%) выказаліся супраць трэцяга тэрміну, 208 чалавек (9,6%) — «за», 17 бюлетэняў выявіліся несапраўднымі. Адзіны пазытыўны момант у жыткавіцкіх тэзах кіраўніка дзяржавы — абяцаньне, што ў Беларусі ня будзе свайго Туркмэнбашы (прэзыдэнта пажыцьцёвага).

Усё гэта адбывалася напярэдадні прэзэнтацыі чарговай кнігі пра Лукашэнку. Завецца яна «Выпадковы прэзыдэнт». Аўтары кнігі, што, як і папярэдняя, была выдадзена ў Расеі, пад псэўдонімамі не хаваліся — гэта Павал Шарамет і Сьвятлана Калінкіна.

А крыху раней у Менску прызямліўся... не, пакуль што не Хрыстос, а Хрыстас Пургурыдэс, сябар юрыдычнага камітэту Парлямэнцкай асамблеі Рады Эўропы. Ён прыехаў зьбіраць дадатковую інфармацыю пра зьніклых беларускіх палітыкаў і журналіста Зьмітра Завадзкага. І Шэйман, і Навумаў зь Сіваковым змушаныя былі пагадзіцца на сустрэчу з Пургурыдэсам. Невядома, пра што канкрэтна ішла гаворка і ў чым прызналіся «сьледчаму» высокія чыноўнікі. У сьнежні Хрыстас зьбіраецца зноў прыехаць у Менск — каб усё ж пабачыцца з падпалкоўнікам Паўлічэнкам, а таксама зьняволенымі Ігнатовічам і Малікам. Першы, дарэчы, цяпер займаецца арганізацыяй дзіцячых спартовых клюбаў.

Улады тым часам не даюць апазыцыі спакойна рыхтавацца да выбараў. Найбольш гучным атрымаўся скандал у Белаазерску, дзе 23 лістапада павінны адбыцца давыбары ў гарсавет. Вэртыкальшчыкі баяцца, што ў Белаазерску дэмакраты могуць узяць у свае рукі заканадаўчую ўладу, таму шалёна цісьнуць на апазыцыйных кандыдатаў. Чацьвёра ўжо зьнялі свае кандыдатуры. Сытуацыя зь Белаазерскам можа стаць знакавай: калі апазыцыйныя сілы пераможуць у адным асобна ўзятым гарадку, гэта прыдасьць ім упэўненасьці ў барацьбе за дэпутацкія мандаты на выбарах у палату прадстаўнікоў. Калі ўлады дамогуцца свайго, гэта будзе першая параза на шляху «пяцёркі-плюс».

Тым часам адзін з кіраўнікоў «пяцёркі-плюс» — лідэр працавікоў Аляксандар Бухвостаў — ізноў на волі. Ён праседзеў 10 дзён у вязьніцы за арганізацыю несанкцыянаванага пікету на сталічнай Кастрычніцкай плошчы. І выйшаў ён адтуль яшчэ больш рашучым і радыкальным палітыкам.

**Алег Тачоны**

# Сёньняшняя сытуацыя з аховай помнікаў нагадвае 1945 год

**Добраўпарадкаваньне гары перад Сьвятадухавым саборам ажыцьцявіў той жа аўтарскі калектыў, які калісь плянаваў пабудаваць на месцы сабору адпачынкавы комплекс з рэстарацыяй.**



**Калісь ад Сьвятадухавага сабору да сёньняшняе Нямігі спускалася пакручастая Казьмадзям’янаўская вуліца — пры саветах вул.Дзям’яна Беднага. Здымак пачатку 30-х гадоў з фонду Музэю гісторыі архітэктуры імя Шчусава ў Маскве.**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**На думку Уладзімера Дзянісава, падбор формаў абмоўлены тым, што аўтарам праекту вельмі падабаюцца крымскія ляндшафты або Пацёмкінская лесьвіца ў Адэсе. На здымку — пабудова, якая спускаецца ад сабору да Нямігі.**

Верхні горад уваходзіць у Сьпіс гісторыка-культурных каштоўнасьцяў як помнік першай катэгорыі. Вышэй толькі нулявая — помнікі сусьветнага значэньня, кшталту Мірскага замку. Пад аховай дзяржавы ў Верхнім горадзе знаходзяцца будынкі й збудаваньні, пляніровачная структура й гістарычны ляндшафт, археалягічны пласт. Там катэгарычна забаронена любое новае будаўніцтва, якое парушае гістарычнае асяродзьдзе, стварэньне транспартных вузлоў і сетак, пракладка паветраных ліній, электрасетак і будаўніцтва трансфарматарных будак. Дазваляецца будаўніцтва, якое спрыяе аднаўленьню гістарычнага асяродзьдзя, а таксама добраўпарадкаваньне, якое не парушае гістарычнага гарадзкога ляндшафту, які ўжо склаўся.

Паводле словаў старшыні менскага Таварыства аховы помнікаў гісторыі й культуры гісторыка Ўладзімера Дзянісава, падчас сёлетняга «добраўпарадкаваньня» былі парушаныя патрабаваньні, якія вызначаюцца законам да каштоўнасьцяў першай катэгорыі. У 1979 г. тэрыторыя Верхняга гораду была абвешчаная гістарычным запаведнікам, што таксама ня ўлічвалася пры «добраўпарадкаваньні». Апроч таго, былі парушаныя міжнародныя канвэнцыі аб ахове культурнай і прыроднай спадчыны, падпісаныя Беларусяй.

«Што ўяўляе сабой гістарычны характар гэтага раёну? Элемэнты старажытнай пляніровачнай структуры старажытнага Менску, якія былі створаныя вулічнай сеткай, сыстэмай зямельных пляцаў і ўнутрыквартальнай пляніроўкі, а таксама фрагмэнтамі сярэднявечных фартыфікацыйных збудаваньняў. У гістарычным сэнсе вельмі важныя суадносіны паміж будынкамі й адкрытай прасторай», — тлумачыць У.Дзянісаў.

### Нэапацёмкінская лесьвіца

Чужая беларускай традыцыі ня толькі XVI—XVII ст., але нават XIX ст. і архітэктура малых формаў (новапаўсталыя лавачкі, ліхтары). На думку У.Дзянісава, падбор формаў абумоўлены тым, што аўтарам праекту вельмі падабаюцца крымскія ляндшафты або Пацёмкінская лесьвіца ў Адэсе. «Нэапацёмкінская лесьвіца» спускаецца ад сабору да Нямігі.

Паводле нормаў закону, дакумэнтацыя для добраўпарадкаваньня на тэрыторыі Верхняга гораду мусіла быць ня проста ўзгодненая з Дэпартамэнтам па ахове гісторыка-культурнай спадчыны, а перад пачаткам работаў разгледжаная Навукова-мэтадычнай радай пры Дэпартамэнце. Няўхваленая Радай, дакумэнтацыя не падлягала зацьвярджэньню. Нармальнай дакумэнтацыі Рада так і ня ўбачыла... Пра гэта сьведчыць і Галіна Саўчанка, сябра Навукова-мэтадычнай рады Дэпартамэнту: «На паседжаньні рады быў зацьверджаны праект, дзе прадугледжвалася захаваньне пляніровачнай структуры. Але, калі сталі выконваць работы, я заўважыла, што будуюць зусім ня тое, што зацьвярджалі. Я зьвярнулася да намесьніка кіраўніка Дэпартамэнту Ігара Чарняўскага з просьбай разабрацца, а ён адаслаў да архітэктара Георгія Багласава — навуковага кіраўніка праекту. Але прычым тут Багласаў? Чаму не пільнуе Навукова-мэтадычная рада, якая зацьвярджала праект?» Паводле словаў Г.Саўчанкі, праект на паседжаньні разглядаўся нават не на макеце, а на пляншэтах: «Але ж з малюнкаў нельга скласьці адпаведнага прастораварга ўяўленьня аб’ектаў».

«Ня быў зроблены гісторыка-апорны плян раёну, на якім павінны быць абазначаныя трасіроўкі вуліцаў, унутрыквартальная пляніроўка, абазначэньне будынкаў і ўсяго, што раён мае каштоўнага, а таксама прывязка да сучаснай забудовы», — дадае У.Дзянісаў.

### Разбурэньні пачаліся пасьля вайны

«Добраўпарадкаваны» схіл належыць да адной з найбольш старых частак Менску: сяліцца тут менчукі сталі яшчэ ў XII ст. Вуліца звалася Казьмадзям’янаўскай — як аднайменная царква. У XVIII ст. гэта была адзіная менская вуліца, цалкам забудаваная мураванымі дамамі. Апроч згаданай царквы тут стаялі кляштары бэрнардынаў і баніфратаў, камяніцы Ваньковічаў, Гейдукевіча. Нават падчас другой сусьветнай вайны будынкі вул.Казьмадзям’янаўскай не былі зьнішчаныя — толькі павыгаралі зьсярэдзіны падчас бамбёжак. На вуліцы сталі пустыя каменныя каробкі. У Нацыянальным гістарычным архіве захаваўся здымак, зроблены нямецкімі лётчыкамі: на ім відаць цудоўная рэнэсансавая пляніроўка раёну.

Асноўныя разбурэньні тут пачаліся пасьля вайны: паводле генэральнага пляну разьвіцьця Менску, аднаўленьня гістарычнага цэнтру папросту не прадугледжвалася. Рэшту гарадзкой забудовы зьнесьлі падчас будаўніцтва другой лініі мэтро. Ад усяе вуліцы засталася толькі адна камяніца XVII—XVIII ст., у якой была аптэка.

«Каля Катэдральнага сабору сваім часам была вельмі прыгожая мураваная агароджа XVII ст.: частка яе была разабраная пры будаўніцтве мэтрапалітэну, але зь цягам часу яна мусіла быць адноўленая, — кажа У.Дзянісаў. — Гэтага не адбылося. Парушаная старажытная пляніроўка пляцу Волі: на месцы, дзе стаяла камяніца Гейдукевіча з славутай тэатральнай заляй (тут дэбютавала дачка Дуніна-Марцінкевіча Каміла), цяпер зрабілі паркоўку для аўтатранспарту, што забаронена й нарматыўнымі дакумэнтамі. Падчас пракладкі камунікацыяў і лініяў электрасеткі проста на сьметнік грузавікамі вывозілі горы цэглы-пальчаткі... Маскоўскія спэцыялісты некалі казалі, што тут праглядаюцца сьляды абарончых збудаваньняў: магчыма, якраз на гэтым пагорку стаяў яшчэ адзін ня знойдзены дагэтуль Менскі замак».

Пасьля будаўніцтва мэтро тэрыторыя доўгі час была закансэрваваная. Потым з ініцыятывы Камітэту па архітэктуры было зробленае прымітыўнае добраўпарадкаваньне: дарожкі, якія цалкам ігнаруюць старажытную трасіроўку вуліцаў, лесьвіца.

### Аўтарскі калектыў перабудаўнікоў

Камуністычная ўлада нішчыла архітэктурныя помнікі, але па іх заставалася гістарычная памяць. Заканадаўства патрабавала перад зносам будынку, які быў пад дзяржаўнай аховай, дэтальна яго дасьледаваць: правесьці ўсе абмеры, зафіксаваць у дакумэнтах. Для гісторыі помнік захоўваўся хаця б «віртуальна». Сёньня ж ніякага сьледу па іх не застаецца нават у архівах. «За раскопкамі папросту прызначаюць археалягічны нагляд: гэта не дасьледаваньне, а назіраньне за зьнішчэньнем помніка», — абураецца У.Дзянісаў. «Большага там і не патрэбна: усё, што маглі, раскапалі, калі будавалі мэтрапалітэн», — пярэчыць яму супрацоўнік Дэпартамэнту па ахове гісторыка-культурнай спадчыны сп.Кулажанка.

Паводле зьвестак У.Дзянісава, аўтары праекту (Барыс Косьціч, Марыя Казак, Марыя Капуцкая, Аляксей Ціханчук) ня хочуць спыняцца на цяперашнім «добраўпарадкаваньні». Яны плянуюць паставіць каля ўваходу ў мэтро гандлёвы цэнтар на 2-3 паверхі.

**Працяг на старонцы 4.**

# Рэстаўрацыя: стаўка большая за жыцьцё

## У СІЗА памёр рэстаўратар Уладзімер Бакаеў

Рэстаўрацыйныя работы — сфэра зусім не такая бяскрыўдная і далёкая ад рэчаіснасьці, як падаецца на першы погляд. Прыкладам гэтага можа быць лёс Уладзімера Бакаева — былога начальніка аддзелу рэстаўрацыі інстытуту «Менскпраект».

Штó ж прывяло месяц таму ў вязьніцу архітэктара, чыімі намаганьнямі былі зробленыя праекты рэканструкцыі вежаў на менскай Прывакзальнай плошчы, будынкаў на плошчы Перамогі, Берасьцейскага вакзалу? Як удалося высьветліць «НН», прычынай затрыманьня стала абвінавачаньне ў атрыманьні хабару. Архітэктару закідалі, што ён узяў 2000 даляраў за ўзгадненьне праекту цырульні.

У ноч з 5 на 6 лістапада У.Бакаеў, якому было крыху за пяцьдзясят, памёр у адным зь менскіх СІЗА. Афіцыйна абвешчаная прычына сьмерці — сардэчная хвароба. Між тым, паводле зьвестак «НН», сьмерць У.Бакаева мае сваю загадку: незадоўга да таго архітэктар пагадзіўся супрацоўнічаць зь сьледзтвам.

АВ

# Ігар Чарняўскі: Добраўпарадкаваньне мае зваротны характар

**На пытаньні «НН» адказвае Ігар Чарняўскі, намесьнік кіраўніка Дэпартамэнту па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі Міністэрства культуры.**

**«НН»: Што за работы вядуцца на схіле гары перад Сьвятадухавым саборам?**

**Ігар Чарняўскі:** У Менску, як і ў шмат якіх іншых гарадах і мястэчках Беларусі, актывізавалася добраўпарадкаваньне тэрыторый. Работы на схіле каля Сьвятадухавага сабору — адзін з этапаў мерапрыемстваў такога роду.

**«НН»: Хто аўтар гэтага праекту і ці былі альтэрнатыўныя прапановы?**

**І.Ч.:** Замоўцам выступае вытворчае падраздзяленьне Менгарвыканкаму — «Менскзеленбуд». З двух прэтэндэнтаў на распрацоўку праекту перавага была аддадзена інстытуту «Белпраект». Галоўным архітэктарам праекту зьяўляецца Барыс Косьціч. Падрыхтаваная пад яго кіраўніцтвам дакумэнтацыя была ўзгодненая з навуковым кіраўніком гістарычнага цэнтру Менску Сяргеем Багласавым. Зацьвердзіла яе навукова-мэтадычная рада па пытаньнях гісторыка-культурнай спадчыны пры Мінкульце.

**«НН»: Ствараецца цалкам новы ляндшафт, уводзяцца рознамаштабныя аб'екты, неўласьцівыя гэтаму асяродзьдзю. Ці разглядалася магчымасьць узнаўленьня колішняга ляндшафту (трасы былое вул.Бедная, будынкаў, што там былі, і г.д.)?**

**І.Ч.:** Страчаную забудову колішняй вуліцы Казьмадзям'янаўскай аднавіць праблематычна. Падчас падрыхтоўкі праекту ўлічваліся новыя горадабудаўнічыя рэаліі, што й выклікала патрэбу стварыць умовы ўспрыманьня забудовы Верхняга гораду ў тым выглядзе, у якім яна дайшла да нашага часу: з цалкам раскрытай панарамай, якая ўтвараецца колішнім кляштарам бернардынак, забудовай «малога» і «вялікага» гасьцінных двароў. У праекце ўлічана і пэрспэктыва рэканструкцыі гэтай часткі гістарычнага цэнтру Менску, у выніку якой будзе разьвівацца Духоўна-адукацыйны цэнтар на базе ранейшых кляштарных будынкаў, забудова па вуліцы Гандлёвай, 27 і двух пакуль няісных дамоў. У праекце прадугледжана таксама і стварэньне ўмоў успрыманьня панарамы гораду, якая распасьціраецца ўздоўж Сьвіслачы.

Праект прынцыпова не мяняе гістарычнага характару гэтай часткі гораду, ня ўносіць нехарактэрных для архітэктуры Менску элемэнтаў і пры любой іншай сытуацыі можа быць рэканструяваны, г.зн. мае зваротны характар, што адпавядае мэтодыцы арганізацыі работ на гістарычных аб'ектах.

**«НН»: Выглядае, што Праваслаўная царква прыстасоўвае кавалак у цэнтры ахоўнай зоны пад свае патрэбы.**

**І.Ч.:** Вы маеце на ўвазе Духоўна-адукацыйны цэнтар Беларускага экзархату, спраектаваны Барысам Косьцічам. Не магу пагадзіцца, што нехта бесьперашкодна «прыстасоўвае пад свае патрэбы» тэрыторыю Верхняга гораду. Ці царква, ці касьцёл, ці суб'екты сьвецкага характару абавязаны кіравацца палажэньнямі заканадаўства. Любы зь іх атрымлівае дазвол на правядзеньне навукова-праектных работ, падае на зацьверджэньне рэстаўрацыйнае заданьне, затым — архітэктурны праект. У выпадку ж парушэньня заканадаўства вызначаны меры адказнасьці, чым органам аховы спадчыны, дзякуй Богу, займацца даводзіцца нячаста.

**«НН»: Былы касьцёл кляштару бэрнардынак, а цяпер сабор Сьвятога Духа, ужо перацярпеў за апошнія паўтара дзясятка гадоў шматлікія зьмены: была разбураная аўтэнтычная агароджа XVII ст., прыбудаваная хрысьцільня ў мадэрным духу, прабітыя праёмы ў ніжніх ярусах вежаў, на фасадах зьявіліся пярэстыя мазаікі, неўласьцівыя стылістыцы помніка... З кім узгадняліся такія радыкальныя зьмены? Чаму, напрыклад, не аднавілі колішняга абрысу стрэхаў касьцёлу й кляштару бэрнардынак і не пакрылі іх дахоўкаю?**

**І.Ч.:** За апошнія гады роля сабору Сьвятога Духа істотна зьмянілася. Высокі глухі мур некалі адгароджваў кляштар ад гарадзкой забудовы. Цяпер перад саборам іншая горадабудаўнічая сытуацыя. Наўрад ці варта шукаць сувязі з пэўнай канфэсіяй, гаворачы пра прымяненьне нейкіх будаўнічых матэрыялаў. На касьцёле Сымона і Алены керамічная дахоўка гадоў сем назад была заменена на мэталадахоўку. Прычынай гэтаму — найперш якасьць сучаснай керамічнай дахоўкі, якая за кароткі час пачынае разбурацца.

Горш, калі прыменены матэрыял паводле сваіх прыкметаў не адпавядае характару гістарычнага будынку. Да прыкладу, дом №2 на плошчы Свабоды накрыты мэталадахоўкай, якая формаю адпавядае вырабам XVIII ст. А будынак адносіцца да XIX ст., калі дахоўка мела іншую форму.

**«НН»: За апошняе дзесяцігодзьдзе ў Менску былі разбураныя дзясяткі помнікаў архітэктуры: вул.Замкавая, Дзімітрава, дамы на вул.Вызваленьня, у Верхнім горадзе, на пл.Мясьнікова, старыя карпусы БДУ, сёньня руйнуецца былы дом купца Ахмеда Офлі на вул.Янкі Купалы — сьпіс можна скласьці даўжэзны. У чым прычына?**

**І.Ч.:** Такая канстатацыя выглядае ў немалой ступені эмацыйнай. Гаворачы пра дзясяткі разбураных помнікаў, відаць, неабходна называць дакладныя адрасы.

Тры будынкі на вуліцы Замкавай разбурыліся або іх аварыйныя канструкцыі разабраны з прычыны нездавальняльнага тэхнічнага стану, на які паўплывала мэтро. Зацьверджана праектная дакумэнтацыя на іх аднаўленьне. Работы ўжо пачаліся. Праблема вуліцы Дзімітрава набыла галоснасьць толькі тады, калі разгарнуліся падзеі вакол будынку №3. Але ж ніхто не апратэставаў цалкам неправавое рашэньне Навукова-мэтадычнай рады 1998 г. аб «непацьверджаньні статусу» будынкаў 7 і 11 на вул.Дзімітрава. Я на тым пасяджэньні казаў, што тым самым на гэтай гістарычнай вуліцы «пастаўлены крыж». Так яно і стала.

Ніхто ў той час не знайшоў дастатковых аргумэнтаў, каб прымусіць адпаведных службовых асобаў вырашыць справу зь Дзяржаўным сьпісам гісторыка-культурных каштоўнасьцяў Беларусі, які да 2002 г. утрымліваў толькі з паўтысячы тых самых каштоўнасьцяў. Гэта дазваляла ў дачыненьні да аб'ектаў спадчыны прымаць адвольныя рашэньні.

Што тычыцца вул.Мясьнікова або старых карпусоў БДУ, то гэтыя пытаньні варта было ставіць гадоў 10—15 таму.

**«НН»: Кампаніі пратэсту супраць зносу капітальнага будынку па вул. Дзімітрава, супраць пабудовы паркінгу на Нямізе ні да чога не прывялі...**

**І.Ч.:** Прапанова аб аднаўленьні забудовы колішняй Нямігі не стасуецца зь міжнароднымі прынцыпамі работы ў старасьвецкім асяродзьдзі, якімі не захоўваецца гістарычнае муляжаваньне. Нельга ня ўлічваць і эканамічных умоваў. Забудова гістарычнай вуліцы знаходзілася на месцы цяперашняй праезнай часткі, пад «Гандлёвым домам на Нямізе» і шматпавярховым жылым будынкам. Акрамя таго, у гэтай частцы гораду ўзьніклі будынкі Дому мод і інстытуту «Прампраект», зьмяніласся ня толькі пляніроўка, але й ляндшафт. Такім чынам, шмат што трэба было б вярнуць назад.

Я хачу запэўніць, што ні на адным з аб'ектаў, на якія сёньня Дэпартамэнт выдае дазволы, ненавуковы падыход ажыцьцёўлены быць ня можа. Гэта не азначае, што ўсё гладка і без праблем. Яны ёсьць, але патрабаваньні да іх вырашэньня зыходзяць з выкананьня нормаў заканадаўства.

**Гутарыў Сяргей Харэўскі**



**Ігар Чарняўскі нарадзіўся ў Чачэрску на Сажы ў 1955 г. Рос у Мядзеле. На гістфаку БДУ спэцыялізаваўся ў археалёгіі. З 1979 г. пачаў працаваць у рэстаўрацыйных майстэрнях. У 1990 г. быў абраны дэпутатам Менгарсавету, узначаліў камісію па культуры, ахове спадчыны і галоснасьці. З траўня 1991 г. прызначаны на пасаду намесьніка начальніка Дэпартамэнту па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі Мінкульту.**

# Сёньняшняя сытуацыя з ахоўвай помнікаў нагадвае 1945 год

Працяг са старонкі 3.

Сваім часам гэты ж аўтарскі калектыў, кажа гісторык, плянаваў пабудаваць на месцы Сьвятадухавага сабору адпачынкавы комплекс з рэстарацыяй. Праект быў узгоднены зь дзяржаўнымі органамі па ахове гісторыка-культурнай спадчыны, але не прайшоў праз Камітэт па архітэктуры.

Гэты ж аўтарскі калектыў распрацаваў быў праект зьнішчэньня яшчэ аднаго гістарычнага помніка — камяніцы на рагу вуліцаў Герцэна і Гандлёвай. На месцы дому меркавалася паставіць 5-павярховы бэтонны офісны цэнтар. Уся дакумэнтацыя была ўзгодненая, але пракуратура спыніла праект, бо высьветліла: заміж абвешчанай рэстаўрацыі плянуецца пабудова новага дому.

«Сёньняшняя сытуацыя з аховай помнікаў гісторыі й культуры нагадвае нават не 60-я, а 1945 год. Рэстаўрацыяй цяпер можа займацца любы калгасны архітэктар, а для напісаньня гістарычнай даведкі бярэцца артыкул з энцыкляпэдыі й цалкам перапісваецца», — сумна канстатуе Дзянісаў.

**Аркадзь Шанскі, Гары Куманецкі**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

## Што трэба зрабіць

**На думку Ўладзімера Дзянісава, у Верхнім горадзе неабходна аднавіць старажытную трасіроўку вуліцаў (насамперш — Казьмадзям'янаўскай), старажытны брук, які захоўваўся да апошняга часу і быў часткова вывезены падчас «добраўпарадкаваньня», пазначыць месцы старажытных помнікаў, правесьці комплексныя дасьледаваньні й знайсьці рэшткі Казьмадзям'янаўскай царквы.**

**У пэрспэктыве можна было б пайсьці польскім шляхам: аднаўляць (а не рэканструяваць) старажытныя будынкі. З сучасных будматэрыялаў ставяцца карпусы старых будынкаў: цалкам аднаўляецца фасад, ставяцца сьцены — атрымліваецца муляж. Падобным шляхам аднаўлялі Траецкае прадмесьце.**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Гарадзкія ўлады не шкадуюць грошай на «эўрарамонт» цэнтральных вуліцаў, як яны гэта разумеюць. Чалавек адказвае падобным: масіўныя дэкаратыўныя келіх на здымку мінакі ператварылі ў попельніцу.**

# Час паразытаў

Паразытарныя хваробы ў большай ступені ўласьцівыя высокаарганізаваным і буйным істотам. То бок зубр пакутуе ад розных паразытаў куды болей, чым жаба. Беларусь сёньня даймае безьліч паразытаў: адныя паразытуюць на савецкім мінулым, другія — на традыцыйных стасунках з суседзямі, трэція — на вобразе змагарнага пакутніцтва. Паразытная вэртыкаль працяла і ўсю беларускую культуру. Сьвінячую валтузьню паразыты ўсчалі вакол спадчыны Мулявіна. Другія без усялякіх ваганьняў круцяць на сваіх хвалях неліцэнзаваныя запісы. Трэція навучыліся «сядаць на хвост» расейскім тэлеканалам. Натуральна. Якую ж канкурэнцыю мог скласьці наш бязладны «Лад» той жа расейскай «Культуры»?

Паразытызм у беларускай архітэктуры — старадаўняя традыцыя. Пры канцы XVIII ст. мянялі абрысы тутэйшага барока на расейскі клясыцызм. У XIX—XX масава перабудоўвалі розныя сьвятыні на цэрквы «в русском вкусе». У 1930-я менскі архіярэйскі палац з царквою перарабілі на Дом афіцэраў (архітэктар І.Лангбард), амаль дакладна скапіяваўшы фасад нямецкай амбасады ў Пецярбургу. А па вайне каталіцкую катэдру Найсьвяцейшае Панны Марыі перарабілі ў духу савецкага манумэнталізму на спартовую залю «Спартак» (архітэктар М.Драздоў). Для беларускага архітэктара паразытызм — амаль натуральны стан. Як інакш «засьвяціцца», калі не прыляпіўшыся да вядомых помнікаў, знакавых месцаў, гістарычных аб’ектаў? Хто паедзе ва Ўручча ці ў Шабаны глядзець твой «шэдэўр»? Там і згубіцца можна. Пагатоў, нічога таленавітага ўсё адно ня створыцца. А вось упоперак Нямігі заслупавацца, як архітэктар Мусінскі, — гэта ўжо салідна. Ну хоць бы якіх дамоў старасьвецкіх паразбурыць у Ракаўскім дзеля свайго «шэдэўру» (архітэктар Грэчын). Чым цынічнейшы і пахабнейшы ўчынак, тым большы розгалас. Паразыт атрымлівае новыя магчымасьці для спажывы. І дзяруць паразыты адзін у аднаго з горла.

Цікавая рэч дыялектыка. Нашчадкі дойлідаў-паразытаў, што даядалі спадчыну «дакастрычніцкага пэрыяду», сёньня дружна, бы шалі сухое дрэва, точаць савецкую спадчыну. Вось ужо ўзарваныя найстарэйшыя карпусы БДУ пачатку 1930-х. Вось ужо безнадзейна зьнявечылі даваенны гатэль «Беларусь», чые нумары маглі б распавесьці нам не адзін раман. Вось ужо прыляпілі люстраную саплю кавярні да самавітага й строгага гмаху Інстытуту фізкультуры. Налятай, братва! Кусай хто што зможа. Можна захінуць сваёй скрынкай з шкла й плястыку пэрспэктыву на царкву Марыі Магдалены. Можна закласьці імпазантны атвор манумэнтальнай аркі 50-х, каб прыткнуць туды якую фірмачку. Можна сьпілаваць стары бульвар, каб панаставіць сваіх падзелак. Можна ліхтары выгнаць у пяць паверхаў вышынёй, каб у іхным цені згубілася ўсё збудаванае раней. Ну хоць бы піўную паставіць перад помнікам Купалу. Дробязь, а ўсё ж капейка.

Цяпер жменя паразытаў пакрысе асвойвае ўжо нават вантробы Менску. Капаюць пад плошчай Незалежнасьці, ушыркі растуць норныя хады пад праспэктам, не за гарамі асваеньне нутра Кастрычніцкай плошчы. Дабраліся й да плошчы Перамогі. «Чаго там яшчэ не хапае?» — запытаецца паспаліты мінак. Нібыта ўжо ёсьць выдатны ансамбль, над якім працавалі пакаленьні дойлідаў і мастакоў яшчэ з даваенных часоў. Ёсьць дамок РСДРП, у якім пасьпеў быў пажыць і Купала; ёсьць «дом Паўлава», у сьценах якога замураваныя цагліны са Сталінграду й «гарадоў-герояў»; памяць пра нямецкіх палонных і пра энкавэдыстаў, пра артыстку Галіну Макараву й пра Лі Харві Освальда, якія жылі тут, пра ўсіх кіраўнікоў СССР і Біла Клінтана ды пра шмат-шмат чаго яшчэ. І тут наіўны мінак памыліцца. Не хапала тут твору архітэктара Занковіча «Магіла невядомага салдата»!

Праект ужо ўхвалены Камітэтам па архітэктуры Менгарвыканкаму. Службоўцы тамака пераважна не тутэйшыя, слаба абазнаныя ў гісторыі Менску. А вось жа мянчук Валянцін Занковіч, як адмысловец, пэўна ведае, што да яго над ансамблем плошчы Перамогі працавалі ад 1932 году выбітныя папярэднікі: архітэктары І.Лангбард, Ю.Кілаватаў, Р.Столер, М.Андросаў, Н.Трахтэнбэрг, Л. і Г.Аранаўскасы, М.Баршч, Г.Заборскі, У.Кароль, М.Парусьнікаў, Г.Баданаў, Л.Мацкевіч, клясыкі беларускага мастацтва З.Азгур, С.Адашкевіч, А.Бембель, А.Глебаў, С.Селіханаў... Усіх і пералічыць няпроста. Праца над гэтым унікальным ансамблем была завершаная падчас будаўніцтва мэтро, у 1984 г. Тады ж плошча была нязначна пераплянаваная (ператварыўшыся з Круглай у авальную) паводле праекту архітэктараў Ларчанкі, Школьнікава й Вязгіна. Але прынцыповай навіною стаў яе падземны ўзровень з мэмарыяльнай заляй памяці савецкіх герояў, палеглых у баях за Беларусь. Іх імёны ў бронзе зьмешчаныя ўздоўж сьценаў залі, пасярэдзіне якое зіхціць з каляровага шкла вянок, створаны выдатным майстрам Вячаславам Пазьняком. (Сярод яго твораў — вітражы ў Галоўпаштамце й у тэатры імя Горкага.) З залі да Вечнага агню вядуць масіўныя лесьвічныя маршы, флянкіраваныя вялікімі гранітнымі блёкамі з бронзавымі рэльефамі працы скульптара М.Рыжанкова.

Занковіч прапануе зьнішчыць тую мэмарыяльную залю. Выкінуць сымбалічны вянок са шкла, замяніць аздобу, прабіцца наверх, да «вечнага агню», замест калёнаў паставіць шэсьць скульптураў.

> У «залі спатрэбіцца правесьці рамонт з прымяненьнем дарагіх матэрыялаў — золата, мармуру, граніту»... Выглядае, што ў Менгарвыканкаме грошы ня ведаюць куды падзець. Ну сапраўды, не парадкаваць жа ўсе тыя мэмарыялы ахвярам войнаў, што ёсьць у сталіцы й ваколіцах.

Відавочна, ляўры папярэднікаў вярэдзяць душу Занковіча. Стаць у адзін шэраг з Азгурам, Бембелем, Глебавым... Дзіўна гучыць і тое, што ў новай шыкоўнай залі разьмесьціцца «рэлігійная сымболіка, што лучыць канфэсіі ўсіх загінулых у Беларусі людзей». Няўжо ж зорка Давіда й мусульманскі паўмесяц зьявяцца пад «вечным агнём»? Сумнеўны сымбалізм выходзіць.

Пры тым у паведамленьні БелаПАН заўважаецца, што ў «залі спатрэбіцца правесьці рамонт з прымяненьнем дарагіх матэрыялаў — золата, мармуру, граніту»... Ну ніяк ня йнакш, а толькі з золатам, пра якое папярэднікі ў XX ст. і ня марылі. Выглядае, што ў Менгарвыканкаме грошы ня ведаюць куды падзець. Ну сапраўды, не парадкаваць жа ўсе тыя мэмарыялы ахвярам войнаў, што ёсьць у сталіцы й ваколіцах. Не даваць жа гэтыя грошы на дамы для старых, у якіх яны ўбога сканчаюць свае пакуты зямныя. А спытаць бы тых вэтэранаў, што дажывуць да 2005 г., куды лепей патраціць іхныя ж грошы? Ці проста аддаць Занковічу й не пытацца, куды ён іх дзене?

Сам В.Занковіч у інтэрвію агенцтву БелаПАН адзначыў, што «да гэтае пары няма вартага мэмарыялу невядомым героям». Тут трэба нагадаць, што гэты архітэктар ёсьць суаўтарам і аўтарам безьлічы мэмарыялаў, прысьвечаных падзеям апошняй вайны: Брэсцкай крэпасьці, «Кацюшы», помнікаў М.Гастэлу, падпольшчыкам, партызанам, кулямётчыкам. Вяршыняю творчасьці Валянціна Занковіча стаў мэмарыял «Менск — горад-герой», што на праспэкце Машэрава! Варта аддаць належнае самакрытыцы архітэктара — нічога «...няма вартага». Адкуль жа бярэцца ў яго ўпэўненасьць, што гэтым разам, зьнішчыўшы твор папярэднікаў, ён створыць што лепшае?

Зрэшты, апэляваць да этыкі тут не выпадае. Якая можа быць мараль у паразытызьме? Сілкуйся сабе з большых арганізмаў, ды ўсё. Калі-небудзь нашую эпоху мяжы XX і XXI ст. гэтак і будуць вызначаць культуролягі — час паразытаў.

**Гары Куманецкі**

# Мост з помпай

**Сапраўднае сьвята надарылася ў Мазыры 5 лістапада. Пасьля амаль трохсот дзён рамонту быў урачыста адчынены аўтамабільны мост цераз Прыпяць, другі па даўжыні ў краіне.**

Сьвята праходзіла ў цёплай атмасфэры непаўторнай савецкасьці. Мост, які злучае горад з аддаленым мікраранам і суседнім райцэнтрам Калінкавічы, аздоблены каляровымі балёнікамі, выглядаў даволі экзатычна. Запаленыя на ім сярод белага дня ліхтарыкі падкрэсьлівалі значнасьць падзеі. Чырвоны транспарант «Слава белорусским дорожникам и мостостроителям» сьведчыў, што стары прывід даўно перастаў швэндацца па Эўропе, стала атабарыўшыся недзе паблізу. Аркестар забаўляў пасапаліты люд варыяцыямі на тэму «Мы рождены, чтоб сказку сделать былью...». Чакалі галоўных герояў дня.

Неўзабаве ўрачыста падкаціла кавалькада аўтамабіляў з двума «мэрсэдэсамі» на чале. На імправізаваную сцэну падняліся афіцыйныя асобы, сярод якіх былі кіраўнік Гомельскай вобласьці спадар Якабсон і дэпутаты парлямэнту таварышы Малафееў і Касьцян. Прысутнасьць такіх высокіх гасьцей тлумачыцца тым, што новы-стары мост ёсьць другім па даўжыні ў Беларусі. Не зважаючы на знаёмы савецкі прысмак сьвята, народ шчыра радаваўся. Бо шпацыраваць пешкі па амаль кілямэтровым мосьце пры любым надвор'і ня кожнаму было дaспадобы.

Выступаючы, прадстаўнікі ведамстваў, адказных за рамонт, жаліліся мазырчукам на фінансавыя цяжкасьці і ў той жа час зьвярталі асаблівую ўвагу на датэрміновае адкрыцьцё мосту. Асабіста я меў гонар даведацца пра важную ролю аўтадарог ва ўмацаваньні магутнасьці дзяржавы. Паводле традыцыі ўзнагародзілі граматамі найлепшых працаўнікоў. Апатэозам сьвята стала разразаньне чырвонай стужачкі пад кволенькія агеньчыкі фаервэрку.

**Рыгор Алейнікаў, Мазыр**

ЭКАНАМІЧНАЯ ХРОНІКА

## Прыватызаваная пятая частка прадпрыемстваў

**З 1991 г. у краіне прыватызавана 21,7% прадпрыемстваў, што былі ва ўласнасьці дзяржавы, паведамляе Міністэрства эканомікі.** На іх працуе 871 тыс. чалавек. Праўда, у шматлікіх утворaных акцыянэрных таварыствах ураду ўсё адно належыць большасьць акцый.

## Урад цураецца бюджэту

**Адміністрацыя прэзыдэнта адмовілася разглядаць альтэрнатыўны праект бюджэту, прапанаваны дэпутатамі з групы «Рэспубліка».** У лісьце, падпісаным кіраўніцай галоўнае дзяржаўна-праўнае ўправы адміністрацыі В.Сяргеевай, гаворыцца, што «ён быў унесены з парушэньнем прадугледжаных нарматыўнымі актамі патрабаваньняў». Дэпутаты выступілі з пратэстам і крытыкай такога ігнараваньня.

## Інтэрнэт дае прыбытак

**Прыбыткі ад продажу рэклямы ў Інтэрнэце ў ЗША склалі за ліпень—верасень 1,66 млрд,** ці на 14% больш, чым за такі ж час летась.

## Адэса—Броды: няпэўнасьць

**Па-ранейшаму няма пэўнасьці ў міжнародным праекце аб пабудове працягу міжнароднага нафтаправоду Адэса—Броды да польскага Плоцку.** Умоваю праекту было напаўненьне трубы высокагатункавай каспійскай нафтай, не кантраляванай Расеяй. Такі плян падтрымлівалі ЗША і Эўразьвяз. З гэтай нагоды ў Кіеве на гэтым тыдні пабываў камісар ЭЗ Крыс Пaтэн. Паводле інфармацыі з украінскай прэсы, Польшча пагражае спыніць перамовы з Украінай, калі да 6 сьнежня па трубе не пацячэ каспійская сыравіна.

## Колькі зарабіў «Velcom»

**Агульны аб'ём інвэстыцый ТАА «МЛС» у эканоміку Беларусі пад канец 2003 г. складзе 210 млн даляраў.** У адпаведнасьці з інвэстыцыйнай праграмай «Velcom» сёлета прадугледжваецца ўкласьці ў эканоміку краіны 50 млн даляраў, 25 млн у бюджэт пойдзе за кошт уласных сродкаў, а агульны аб'ём інвэстыцый у будаўніцтва сеткі «Velcom» склаў 135 млн даляраў.

## Юбілей «Вечернего Бреста»

**Найбольшая газэта Берасьцейшчыны выпусьціла свой 1000-ы нумар.** Пры тыднёвым накладзе 45 тыс. асобнікаў яна выходзіць двойчы на тыдзень.

**МБ; БелаПАН**

# Цяпло не дапякло

**Энэргетыкаў з баранавіцкіх прадпрыемстваў выклікалі ў вобласьць, загадалі жорстка ашчаджаць газ і мазуту, каб наэканоміць 40% энэргіі.**



ЮГ

Неяк у Гданьску, вандруючы студэнтам, давялося начаваць у двухпакаёвым нумары разам зь сябрам. Было гэта ў сакавіку. У першую ноч мы добра намерзьліся ў пакоі, праклінаючы палякаў зь іх эканоміяй на ацяпленьні. Калі б ня пляшка віна, дык мо да раніцы і зьледзянелі б.

Ранкам я, зайшоўшы ў суседні пакой, ледзь не самлеў ад сьпякоты. Мо ў нас няспраўная сыстэма ацяпленьня? Выявілася, што на кожным радыятары пад акном маецца рэгулятар, які дае магчымасьць выстаўляць патрэбную тэмпэратуру. Для нас гэта была навінка. Ішоў 1998 год.

Пару тыдняў таму адзін паляк, які па справах заскочыў у Баранавічы, заначаваў у знаёмых. Наш сусед з-за Бугу доўга абмацваў радыятары, цягаючыся з пакою ў пакой ды хутаючыся ў коўдры. Якраз пад яго прыезд на дварэ пацяплела і мясцовыя кацельні амаль перасталі выпрацоўваць цяпло. Зь вечару «раптоўна» пачало халадаць, але загаду ўключаць качагаркі не было...

Дагэтуль эканоміць у нас вельмі дзіўна. На пачатку зімы міністэрствы распрацоўваюць розныя пляны, пралічваецца колькасьць рэсурсаў. Ашчаджаюць на дробязях. Затое па вясьне, калі, дзякаваць Богу, зіму перажылі, рэшты рэсурсаў выпальваюцца як га. І на дварэ цёпла, і ў хаце не прадыхнуць.

Энэргетыкаў з баранавіцкіх прадпрыемстаў выклікалі ў вобласьць, загадалі жорстка ашчаджаць газ і мазуту, каб наэканоміць 40% энэргіі. Спэцыялісты чухаюць патыліцы — які гэта знайсьці цяперка ўнутраны рэсурс, каб энэргіі выпрацоўваць мала, а рост прадукцыі ўвесь час быў. І дзівяцца, чаму нельга выкарыстоўваць газу колькі патрэбна, калі прадпрыемствы за яго разьлічваюцца. Але паперы падпісваюць і эканомяць на ацяпленьні цэхаў і кабінэтаў.

Міністар ЖКГ Аляксандар Мількота ня так даўно заявіў, што кошты зімою сёлета за кватэры будуць 130 тыс. за трохпакаёўку на чатырох і 50 тыс. за аднапакаёўку на трох. Першыя знакі гэтага атрымалі ў кастрычніцкіх жыроўках.

Просты люд наракае на вялікія цэны за цяпло, аднак пакуль яго, відаць, ня вельмі дапякло — ня чухаюцца, каб пачаць ставіць цеплалічыльнікі, як гэта робіцца ў суседняй Літве. Там у газэтах нават інфрачырвоны здымак некалі надрукавалі, на якім відаць, як праз шчыліны ў панэльных дамах цяпло вылятае. Цяпер тыя савецкія будоўлі абкладаюць адмысловымі шубамі за кошт жыхароў саміх дамоў.

Ну, а пакуль няма цеплалічыльніка, як кажа мой знаёмы, няма чаго і кранцікі на радыятары ставіць. Паменшыць тэмпэратуру ў кватэры, можа, і здолееш, а вось павялічыць не заўсёды пашчасьціць. Дый плаціць будзеш усё адно «як усе».

**Руслан Равяка, Баранавічы**

# Падчарка ТІВО

Для сёньняшняй Беларусі дзьве кампутарныя выставы на год — гэта зашмат. Масьцітая ТІВО ўвесну здымае ўсе вяршкі, так што восеньская «Пэрспэктыўныя тэхналёгіі і сыстэмы» традыцыйна мае праблемы як з наведнікамі, так і з экспанатамі. Леташнія спробы арганізатараў падвысіць папулярнасьць выставы за кошт конкурсу на найлепшы хатні кампутар году і турніру кампутарных гульняў («кібэрспорт», як модна стала казаць) толькі зрабілі горай. На выставу хлынула дзятва. Яна, не раўнуючы што саранча, паглынала-разьмятала ўсе рэклямныя матэрыялы, чым стварала немалыя перашкоды працы дзелавой часткі. Ці можа быць горш? Напэўна, такое пытаньне ўзьнікала ў кампаніяў, што наважыліся прыняць удзел у PTS'2003. Выявілася, што так.




PHOTO.BYMEDIA.NET

Сёлета арганізатары вырашылі, што дапамагчы прыцягнуць наведнікаў і ўдзельнікаў можа толькі адзін чалавек у гэтай краіне. Той самы. За некалькі месяцаў ва ўсіх рэклямных абвестках можна было чытаць, што выстава PTS'2003 пройдзе пад патранажам прэзыдэнта Беларусі. Але на адкрыцьцё выставы ён не пайшоў. За шэфа прамаўлялі Пралясcкоўскі і Мясьніковіч. Цікава, што побач зь імі стаяла спадарыня Ярмошына. Мо кампутар для дому прыглядзець прыйшла. А мо тэхналёгіі, якія выкарыстоўвае ЦВК, ужо састарэлі і трэба новыя падшукаць, больш пэрспэктыўныя.

Спачатку было абвешчана, што візыт пэршай асобы адбудзецца сёмага, але потым дата была перанесеная на шостага лістапада. За дзень да гэтага выставу зачынілі на гадзіну раней, усіх вывелі з памяшканьня — пачалася рэпэтыцыя. Наступным днём выстава была зачыненая для наведнікаў да 15.00. Служба бясьпекі пускала ня больш чым па два чалавекі на стэнд — і толькі самых правераных. Лукашэнка зьявіўся пасьля 13-й. Хутка прайшоў палову пуставатай залі, сказаў прамову пра важнасьць сучасных тэхналёгіяў і сышоў. «Унукам буду потым расказваць: дзедушку Леніна бачыла», — заўважыла знаёмая, якой «пашчасьціла» трапіць на стэнд.

Выстава ж была ня вельмі цікавай. За бракам уласна тэхналёгіяў удзельнікі забаўлялі публіку хто чым. «Белтэлекам» — рыцарскімі двубоямі, «МТС» — выступленьнямі кавэкашнікаў, «Вэлкам» дык проста зрабіў на ўвесь другі паверх адну вялікую дыскатэку і бар. З таго, што запомнілася, — экспазыцыі двух беларускіх вытворцаў тэлевізараў: «Гарызонту» ды «Віцязю». Абедзьве кампаніі дэманстравалі новыя мадэлі пляскатых тэлевізараў і кампутарных манітораў на вадкіх крышталях. У сэрыйную вытворчасьць гэтая прадукцыя мае пайсьці налета.

У межах выставы прайшоў першы конкурс айчынных эканамічных праграмаў. Папярэдні праводзіўся ў 1999 г., але быў інтэрнацыянальны. Цяпер да спаборніцтва дапускаліся толькі беларускія альбо сумесныя распрацоўкі. 12 кампаніяў бралі ўдзел у чатырох намінацыях. Ва ўсіх перамогу атрымала «Галактыка». Астатнія прызавыя месцы падзялілі паміж сабой пяць кампаніяў: «МАП і Х'юмэн» (сыстэмы аўтаматызацыі бухгальтарскага ўліку), «Брава» (сыстэмы аўтаматызацыі гандлю і комплексныя інтэграваныя сыстэмы кіраваньня прадпрыемствам), «ЛюксСофт Плюс» (сыстэмы аўтаматызацыі дакумэнтаабароту, сыстэмы аўтаматызацыі гандлю) і «Golden Software» (комплексныя інтэграваныя сыстэмы кіраваньня прадпрыемствам і сыстэмы аўтаматызацыі дакумэнтаабароту). Як зазначыў адзін з арганізатараў конкурсу, дырэктар парталу TUT.BY Юры Зісер, «Галоўнае, што засьведчыў конкурс, гэта тое, што распрацоўкі беларускіх кампаніяў ня толькі не саступаюць замежным, але шмат у чым нават пераўзыходзяць іх».

**Андрэй Кірэеў**

# Аксана Новікава: «Ёсьць іншая барацьба»

**Працяг са старонкі 1.**

Дзякуючы найперш ёй я стала цікавіцца, хадзіць на масавыя акцыі. Асабліва мяне абурыла, калі аднойчы, падчас акцыі на Траецкай горцы ўлетку, улады падагналі гучнамоўнікі й аўтобусы ды сталі заклікаць: «Схадзіце лепш чаю папіце. Або паедзьце адпачніце на Менскае мора. Там гуляньне, мы вам і аўтобусы падамо!» Такое не забываецца. Потым надышоў пэрыяд працы на сябе. Я шмат працавала й не мяшалася ў палітыку.

**«НН»: Што Вы рабілі?**

**А.Н.:** Была прыватнай прадпрымальніцай. Гуртовы гандаль. І мела магчымасьць бачыць, што адбываецца ў эканоміцы. Тады эканоміку ой як ціснулі. А гэтае бязьмежжа з курсамі даляра, якіх было шэсьць — для сваіх, для вельмі сваіх і вельмі чужых. Задушэньне дзелавой ініцыятывы, нацыяналізацыя эканомікі — гэта прымусіла мяне пасьлядоўна дзейнічаць у згодзе з сваімі перакананьнямі й інтарэсамі маёй дачкі і маёй краіны.

**«НН»: Але чаму Вы абралі шлях самотнай ваўчыцы? Можа, трэба было далучыцца да партыі, прафзьвязу, руху?**

**А.Н.:** Я не хацела абмяжоўваць сябе партыйнымі рамкамі. Партыі ў нас ня могуць пераадолець свае рознагалосьсі.

**«НН»: А Вы не баіцёся, што Вас палічаць вар'яткай-адзіночкай або асобай, якая набірае балы для палітычных уцёкаў?**

**А.Н:** Не, не баюся. Я была ў Францыі з 2001 да 2002 году, нарадзіла там дачку й вярнулася. Зьехала я праз непрыемнасьці з уладамі. Пайшла ў 2001 г. на Дзень Волі з плякатам «Свабоду Клімаву!». Я тады была на сёмым месяцы цяжарнасьці. І пачаліся ў мяне праблемы. Я выехала ў Францыю, нарадзіла дачку, пачакала, пакуль тут справа рассмокчацца. І вярнулася. Трэба ў Беларусі зрабіць добра, а ў Францыі яны й самі разьбяруцца.

**«НН»: Ваш шлях — грамадзянскае непадпарадкаваньне?**

**А.Н.:** Так. Калі адміністрацыйная камісія прыняла рашэньне аштрафаваць мяне за акцыю на 12 тыс. рублёў, я адмовілася плаціць. Я павінна хадзіць у міліцыю адзначацца, як умоўна асуджаная, але я не хадзіла ані разу. Я не лічу сябе вінаватай і не выконваю незаконных рашэньняў. Пра гэта я напісала ў Камісію ААН па правох чалавека.

**«НН»: На інтэрнэт-форуме напісалі: «Новікава спрабуе стаўчы малако лапкамі, але не падазрае, што таўчэцца ў твані». А з твані ж масла не саб'еш?**

**А.Н.:** Людзі ў Беларусі — далёка не балота. Яны тут вельмі розныя. Урэшце, у твані рыба вядзецца.

**«НН»: Бесхрыбетныя ўюны, што жыруюць у брудзе?**

**АН.:** Але вядуцца. А калі сур'ёзна, я стараюся прымусіць людзей задумацца. Не звычайных людзей, якія мала пра што ведаюць. Я пра моладзь, якая ёсьць пры партыях і грамадзкіх рухах. Я хачу ім давесьці, што ёсьць іншая барацьба, ня толькі ж выбарамі займацца. Выбары — добра, але гэта ня ўсё. Як мы здолеем адстаяць тое, што здабудзем на выбарах, калі ў нас ня будзе досьведу мірнага супраціву? Досьведу непадпарадкаваньня?

**«НН»: Калі беларусы небезнадзейныя, дык чаго Вы так адчайна крычыце ў Інтэрнэце: «Дзе вы, нашчадкі Вялікага Княства?»**

**А.Н.:** Правакую. Нашчадкі вялікіх князёў — моцныя й мужныя людзі, і хацелася б іх бачыць як мага болей.

**«НН»: Як Вы наважыліся выйсьці зь лёзунгам «Буш, Блэр, вы маеце рацыю»? Бальшыня ж беларусаў не падтрымала вайны ў Іраку.**

**А.Н.:** Дыктатары атрымалі ўрок таго, што яны ня могуць беспакарана рабіць зло ў сваёй краіне. Шкада толькі тых, хто загінуў. Усе павінны заступацца за ўсіх.

**«НН»: Раскажыце, калі ласка, пра Вашу дачку.**

**А.Н.:** Яе завуць Рыяна. Бабулю мае маці клікалі Рыяна. Яе маці захаплялася Оскарам Уайльдам. «Рыяна» — вытворнае ад «Дарыяна», Дарыяна Грэя. Так атрымалася, што дачку я гадую сама. Я ёй даю волю і сачу, каб яна не зрабіла шкоды сабе й людзям. Яна адчыняе дзьверы, заходзіць ва ўстановы, азірае іх і выходзіць. Яна можа маляваць на шпалерах. Я чытаю ёй казкі. Гэта вольнае й слухмянае дзіця.

**«НН»: Але ж Вы маглі пашкодзіць дзіцяці сваёй дзейнасьцю?**

**А.Н.:** Пашкодзіць ніяк не магла. Яна вырасьце і ня будзе саромецца таго, кім была яе маці. Лукашызм скончыцца, і дзецям шмат якіх чыноўнікаў стане непрыемна. А маёй сорамна ня будзе.

**«НН»: Вы ўсьміхаецеся шырока й даверліва ў гутарцы. Чаму Вы такая пахмурная на акцыях, у судох?**

**А.Н.:** Я нармальны чалавек, і мне страшна. У такія моманты не да ўсьмешак — я думаю пра наступствы маіх учынкаў.

**«НН»: Вы зазналі фізычны гвалт падчас акцыяў?**

**А.Н.:** Аднойчы мяне арыштавалі вельмі груба. І кідалі груба ў машыну. Гэта было 23 сакавіка 2000 г. падчас Дня Волі на пляцы Якуба Коласа.

Я сапраўды невяўнічы чалавек. Калі лукашызм сыдзе, я зноў пасьпяхова займуся бізнэсам. А ўвогуле, я люблю ціха сядзець дома й вышываць. Я вышываю абрусы, прасьцірадлы, раблю гафтаванкі.

**«НН»: Чаму Вы цяпер ня зоймецеся бізнэсам?**

**А.Н.:** Мне гэтага нельга рабіць пад сваім імем. Мяне зачынілі, бо я падчас цяжарнасьці затрымала квартальную справаздачу аб дзейнасьці. Прыдраліся й зачынілі. Таму цяпер я проста гадую дачку і патроху займаюся грамадзкай дзейнасьцю.

**«НН»: Вам 30 гадоў. Як і мне. Вы не баіцёся, што рэжым пратрымаецца акурат да нашае пэнсіі?**

**А.Н.:** Я думаю, не. У Беларусі ёсьць воля й сіла для зьмены сытуацыі.

**«НН»: Чаму Вы не гаворыце па-беларуску?**

**А.Н.:** У школе мова й літаратура ішлі факультатыўным прадметам. Я іх ня вывучыла. А сёньня мне ня хочацца крыўляцца на трасянцы. Але я падтрымліваю змаганьне Беларускага ліцэю так, быццам гэта непасрэдна тычыцца мяне. У багацьці формаў адукацыі, плюралізьме — сіла кожнай дзяржавы.

**«НН»: Дачку будзеце вучыць Беларушчыне?**

**А.Н.:** Ня ведаю. Хай сама наконт гэтага вырашае. Беларусь можа быць дзьвюхмоўнай, але незалежнай і асобнай. Ёсьць шмат краінаў, дзе моваў некалькі. Тая ж Бэльгія, дзе гавораць на француcкай і фламандзкай. Нармалёвая краіна — Бэльгія, «дзе каровы прыгажэйшыя за жанчын».

**«НН»: Дапусьцім, сымбаль Бэльгіі — карова. А Беларусі?**

**А.Н.:** Я не шукаю сымбалю Беларусі ў мінуўшчыне. Беларусы ўжо ня тыя, што былі чатырыста, трыста гадоў таму. Тут столькі войнаў пракацілася, гэтулькі крыві сышло й абнавілася! Мы заўжды маладыя. Беларусь для мяне — маладая дзяўчына, што рушыць наперад.

**«НН»: Беларусы ня тыя, кажаце Вы. Я якія?**

**А.Н.:** Я думаю пра тое, што нас набліжае да эўрапейцаў, — нашую павальную законапаслухмянасьць. Я думаю і пра тое, што нас аддзяляе ад Эўропы, — нашую павальную агрэсіўнасьць. Я думаю, калі гэтую агрэсію слушна скіраваць, яна й зьмяце рэжым. Добры патэнцыял. Менавіта таму нас увесь час заклінаюць: «Ах, вы талерантныя, ах, вы памяркоўныя!» Але прырода верх возьме.

**Гутарыла Сьвятлана Курс**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Я нармальны чалавек, і мне страшна. У такія моманты не да ўсьмешак — я думаю пра наступствы маіх учынкаў.

## Віктар Мязяк атрымаў «зялёную картку» па-беларуску

**Пасьведчаньне сацыяльнага страхаваньня па-беларуску атрымаў баранавіцкі бізнэсовец Віктар Мязяк.** Зрабіць гэта, як ён кажа, даволі проста: «Улетку мне патэлефанавалі й папрасілі прыйсьці ў Фонд сацыяльнай абароны па пасьведчаньне. Усе паперы былі аформленыя, і маладая дзяўчына працягнула мне тую зялёную картку па-расейску. Я зьвяртаюся прадпрымальнікам, плачу падаткі й таму патлумачыў ёй, што жадаю атрымаць пасьведчаньне на першай дзяржаўнай мове.

Маладзіца праз якія 3-4 хвіліны прынесла блянк, таксама расейскамоўны. Туды папрасіла запісаць усе зьвесткі на беларускай мове. Тамака ж я напісаў заяву, каб пасьведчаньне перарабілі па-беларуску.

Прайшло недзе 2 месяцы, я ўжо й забыўся пра той выпадак, як зноўку мне затэлефанавалі і запрасілі прыйсьці зноў. Мне ўручылі пасьведчаньне на беларускай мове. Прысутнічала нейкая кіраўнічка, у якой я тады запытаўся, ці шмат гэных пасьведчаньняў выдалі ў горадзе. Як выявілася, выдадзены яны 90% жыхарам Баранавіч. Але толькі я адзін запатрабаваў яго па-беларуску. Мяне папрасілі яго, крый Божа, не губляць, бо вельмі цяжка будзе аднавіць. Па-беларуску вырабіць у Берасьці яго ня здолелі, вазілі аж у Менск.

Безь ніякага гвалту і енкаў у мяне прынялі заяву й пасьля гэтак спакойна зрабілі тую цыдулку. Трэба менш плакаць аб цяжкім лёсе нашай мовы, а проста прыйсьці і запатрабаваць. Проста трэба не ленавацца...»

**Запісаў РР**

## ХРОНІКА ЎЦІСКУ

**7 лістапада ў Гомелі міліцыя двойчы затрымлівала арганізатараў грамадзкага галасаваньня супраць зьменаў у Канстытуцыі й працягу прэзыдэнцкіх паўнамоцтваў Лукашэнкі.** Сьпярша **Алеся Карніенку** й **Сяргея Сямёнава** ўзялі на Цэнтральным рынку з скрыняй для галасаваньня ды канфіскавалі бюлетэні. Потым таго ж А.Карніенку разам з **Васілём Паляковым** забралі ў пастарунак за парушэньне парадку правядзеньня масавых акцыяў: маўляў, падавалі заяўку на пікет, а не на галасаваньне. 10 лістапада ў цэнтры Менску былі затрыманыя актывісты незарэгістраванага «Маладога фронту» **Зьміцер Дашкевіч**, **Артур Фінькевіч** і **Алег Гнетчык**: яны расклейвалі ўлёткі з заклікам узяць удзел у антырэфэрэндумнай акцыі 24 лістапада. На маладафронтаўцаў склалі пратаколы за распаўсюд незарэгістраванай друкаванай прадукцыі й адпусьцілі. Цяпер хлопцам пагражаюць штрафы. Сябры віцебскай філіі КХП-БНФ **Ігар Мацьвееў**, **Алесь Пазьняк**, **Ян Дзяржаўцаў**, якія ўдзельнічалі ў несанкцыяваным шэсьці на Дзяды, атрымалі судовыя папярэджаньні. І.Мацьвееў і А.Пазьняк, да таго ж, правялі суткі ў сьледчым ізалятары.

**АШ**

## ДАВЕДКА «НН»

Аксана Новікава нарадзілася 11 ліпеня 1973 г. у вёсцы Клыпаўшчыне Койданаўскага раёну ў сям'і будаўнікоў. Атрымала бухгалтарскую адукацыю, працавала прыватнай прадпрымальніцай. Сама выхоўвае дачку Рыяну.

# Быць беларусам — проста работа



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

**Быць літоўцам або палякам — работа ніяк не лягчэйшая. Адно што літоўцы і палякі прывучаныя да яе зь дзяцінства. Прыкладна так, як вясковыя дзеці лепей прывучаныя да працы за пешчаных гарадзкіх.**

Чаму ў параўнаньні з нашымі суседзямі, літоўцамі або палякамі, мы, беларусы, маем ніжэйшыя стандарты жыцьця? Чаму ў нас няма такіх зручных супэрмаркетаў, такіх бездакорных аўтасэрвісаў, такіх утульных і густоўных гарадоў і кватэр? Чаму мы бяднейшыя? Чаму ня ведаем, што ў нас будзе заўтра? Чаму іхнае жыцьцё гатовае выклікаць у нас зайздрасьць? Хіба мы горай працуем, альбо Бог даў нам меней розум, ці гэта над намі вісіць нейкі фатальны лёс? Можа быць, вінаватая ўлада? Але якая ўлада прымусіла ўладальніцу прыватнага кіёску павесіць на зачыненых дзьвярах таблічку «Ушла на базу»? А можа, уся справа ў тым, што літоўцы і палякі — нацыяналісты? Цяжка сказаць, што сёньня значыць гэтае слова. Але калі тое, што яны нацыяналісты, дазваляе ім жыць лепей, можа быць, варта стаць нацыяналістамі і нам?

Праўда, каб гэта зрабіць — трэба рабіць, названа недастаткова. Пакінем у спакоі занадта шырокі і спрэчны тэрмін «нацыяналізм» і паспрабуем убачыць сутнасьць праблемы.

Сапраўды, быць палякам або літоўцам і быць беларусам — розныя рэчы. Гэта вельмі добра разумеюць тыя, хто ў Менску карыстаецца роднай мовай. Колькі лішніх пытаньняў, колькі насьмешак або наадварот — недарэчнага энтузіязму... Быць беларусам — скажа вам кожны такі беларускамоўны — гэта работа, штодзённая і не заўсёды лёгкая. Што ж, няхай сабе работа, але чаму б яе не рабіць, калі яна ўрэшце акупляецца.

Гаворка ідзе не пра нейкія сакральныя рэчы або таемныя пачуцьці, а пра звычайную работу. Быць беларусам — гэта работа.

Між іншым, быць літоўцам або палякам — работа ніяк не лягчэйшая. Адно што літоўцы і палякі прывучаныя да яе зь дзяцінства. Прыкладна так, як вясковыя дзеці лепей прывучаныя да працы за пешчаных гарадзкіх.

Пры ўсім нашым пашыраным уяўленьні пра касмапалітызм заходніх эўрапейцаў, быць французам або швэдам, або ангельцам ці немцам — таксама работа.

Быць беларусам — такая ж работа, як быць жаданым для іншага, быць пасьпяховым, быць такім, якім хочацца быць іншаму. Тут без намаганьняў нічога не даецца. Урэшце, ніхто не аспрэчвае, што раніцай трэба пачысьціць зубы, апрануцца ці скласьці ложак. Бывае, ня хочацца, але мы робім гэтую работу. Мы робім сваю работу сына або дачкі, мужа ці жонкі, бацькі або маці. І зусім неабавязкова тая работа прыносіць задавальненьне — бывае па-рознаму. Гэткай самай неад'емнай штодзённай работай ёсьць і наша работа быць беларусам. Альтэрнатывы няма, бо быць нікім — гэта не альтэрнатыва.

Быць — ня значыць толькі называцца. Ня можа быць у пашпарце запісу — «прыстойны чалавек», бо прыстойнасьць — гэта работа. Тое самае і быць беларусам.

Ад работы быць беларусам нас адвучылі за савецкім часам. Тады хто рабіў — той вытыркаўся з натоўпу. Астатнія прыцярпеліся да нацыянальнага ўтрыманства і нігілізму. Мы вызвалялі (або не адмовіліся б вызваліць) дзяцей ад беларускай мовы ў школе, тым самым пазбаўляючы іх гэтай работы — быць беларусам. Расейшчына не была нашай культурай, але нам дазвалялася жыць у яе полі бясплатна. Калі, вядома, не лічыць платаю нашу неработу і нашу чалавечую прыстойнасьць у вачох іншых, хто нас атачае.

Быць расейцам у сёньняшнім сьвеце — гэта таксама работа. Таму беларусы, каб не рабіць, з гонарам кажуць, што яны — беларусы, хоць і карыстаюцца расейскай мовай, расейскімі СМІ і расейскай мас-культурай, як сваімі. Яны ня робяць работы быць расейцамі, але яны ня робяць работы і быць беларусамі. Яны абралі сабе своеасаблівы варыянт — называцца беларусам, а існаваць за кошт плёну працы тых, хто робіць работу быць расейцам. Інэрцыя таго часу трымае ў палоне і новыя пакаленьні нашых супляменьнікаў.

Сёньняшні малады беларус, асабліва той, якому давялося пабываць на Захадзе, часьцяком абураецца стандартамі жыцьця ў сябе на радзіме. Там, кажа ён, людзі жывуць багата, густоўна і камфортна. Адкуль у іх гэта? Хіба мы горшыя? Аднак, зь іншага боку, калі з такім беларусам заводзіш гутарку пра патрэбу ня толькі называцца беларусам, але і быць ім, найчасьцей чуеш адказ: «А навошта, мне і так нармальна». Ён ня зьвязвае наяўнасьці лепшых стандартаў на Захадзе з сваім нежаданьнем рабіць этычную работу і з тым, што ўсё ягонае грамадзтва працівіцца такой этычнай рабоце. Ён абураецца тым, што паўсюль у Беларусі сустракае таблічку «Ушла на базу» і што нідзе на Захадзе такой таблічкі проста ня можа быць, але пры гэтым не разумее, што, каб яе не было і ў нас, ты мусіш рабіць работу — быць беларусам.

Савецкае ўтрыманства спакваля перацякло ў постсавецкую ленасьць. Улады беражліва ахоўваюць гэты сон душы народу. Яны ж самі ня робяць гэтае работы, падыгрываючы найгоршым інстынктам чалавечага арганізму. Духоўная работа — справа царкоўнікаў, разважаюць яны, нам абы чарка ды скварка. У выніку стандарт жыцьця апускаецца да фізіялягічных патрэбаў, а рэальная духоўная работа захінаецца грэблівым жупелам нацыяналізму. Нас бясконца раздражняе адсутнасьць добрага сэрвісу, але нас раздражняе і наўрымсьлівасьць гэтых беларускамоўных — нашто ім тое трэба? Нам і так нармальна...

Думаючы пра якасьць жыцьця, мы мусім разумець, што маем толькі такі выбар: альбо быць беларусам, альбо — «Ушла на базу». Іншага ня дадзена.

Азірнецеся ў сваім асяродзьдзі. І сярод тых, хто ня робіць гэтай работы — быць беларусам, — вы ня знойдзеце прыкладу жыцьцёвага стандарту, паводле якога вам самім хацелася б жыць. Тут няма жаданага прыкладу для пераймальня. Усе гэткія прыклады — недзе, дзе робяць работу паляк і літовец, швэд і француз. І тыя ў Беларусі, хто робіць такую работу, як бы невыносна ім тое ні здавалася, — яны ўрэшце адзіныя, хто ўздымаецца да новага стандарту жыцьця і стане жаданым прыкладам для іншых.

Або жыць па-сьвінску, або па-людзку. Быць чалавекам — таксама работа. Таму пытаньне лепшага жыцьця мае і свой адваротны, этычны бок. Ці магу я расслабіцца, дазволіць сабе крыху ляноты, калі ўсё маё атачэньне і ўсё грамадзтва сабе гэта дазваляе? Ці апраўданае маё ўласнае сьвінства ў маіх уласных вачох тым, што я існую сярод сьвінства? Ці мушу я не паддавацца гіпнозу натоўпу і рабіць сваю работу — быць беларусам?

Тут адказ кожны дасьць сабе сам.

**Сяргей Дубавец**

# Слова маўклівых

Паўтары сотні старонак з вынікамі апытаньня пад агульнымназвам «Ірак і мір у сьвеце», зладжанага «Эўрабаромэтрам» (http://europa.eu.int/comm /public_opinion), наўрад ці зацікавілі б кагосьці, акрамя спэцыялістаў, каб не адно пабочнае пытаньне. Ці можа прыцягнуць увагу грамадзкасьці тое, што дзьве трэціны жыхароў Эўразьвязу лічаць амэрыканскую інтэрвэнцыю ў Ірак неабгрунтаванай, што яны прыхільна ставяцца да ўдзелу ў адбудове гэтай краіны, у гуманітарнай дапамозе іракцам і ўрэгуляваньні на Блізкім Усходзе?

Буру выклікалі адказы на пабочнае пытаньне: якія краіны ствараюць пагрозу міру ў сьвеце. Зь сьпісу на пятнаццаць дзяржаваў на першае месца ўпэўнена выйшаў Ізраіль (59%), другое месца падзялілі Іран, Паўночная Карэя і Злучаныя Штаты (па 53%). Гэта ўжо нетрывіяльна.

Найвастрэй адрэагавалі Ізраіль і габрэйскія арганізацыі ў ЗША. Акрамя клеймаваньня антысэмітызмам, расізмам і згадак пра вынішчэньне габрэяў у другую сусьветную вайну, прагучалі заклікі і пагрозы выключыць Эўразьвяз з удзелу ў блізкаўсходнім мірным працэсе. Італьянскі міністар замежных справаў Фраціні (цяпер Італія ўзначальвае ЭЗ) пасьпяшаўся нагадаць, што вынікі апытаньня не адлюстроўваюць афіцыйнай пазыцыі Эўразьвязу, — сьмелае выказваньне для палітыка дэмакратычнай краіны, залежнага ад выбару тых самых масаў, погляды якіх апытаньні закліканыя выяўляць.

Яшчэ цікавей прыслухацца да памяркоўных галасоў з ізраільскага боку, дзе апошнім часам часьцей выходзіць на паверхню незадаволенасьць жорсткай палітыкай у палестынскай праблеме. Апытаньне прыйшло ў нязручны для Ізраілю час, сьцьвярджаючы яны, якраз адбываюцца жорсткія пацыфікацыі, уключна з бамбаваньнем аб'ектаў на сырыйскай тэрыторыі, агучваюцца пляны атакі на іранскія атамныя аб'екты і праекты пабудовы ахоўнай сьцяны на мяжы з палестынцамі. Не абышлося без нараканьняў на тое, што малюнак сьвету, які праз СМІ фармуецца ў сярэднега эўрапейца, зьяўляецца сур'ёзнай праблемай. Але чыёй?

Глыбокае дасьледаваньне народных поглядаў заўжды выклікае стрэс што ў палітыкаў, што ў аналітыкаў. Грамадзкая сьвядомасьць абурае сваёй нелягічнасьцю, несыстэмнасьцю, слабым, марудным і непрадказальным водгукам на прапагандысцкія высілкі. Табліцы і дыяграмы сацыёлягаў хаваюць малапрыемныя для грамадзкіх дзеячоў сэнсацыі (ЗША лічаць пагрозай міру 55% брытанцаў — верных хаўрусьнікаў, але толькі 52% не нагэтулькі аддадных французаў і 45% немцаў). Разгадка, як падаецца, у асаблівасьцях правілаў гульні на палітычнай сцэне.

**Малюнак сьвету, які праз СМІ фармуецца ў сярэдняга эўрапейца, зьяўляецца сур'ёзнай праблемай. Але чыёй?**

Публічнаму дзеячу ў заходнім сьвеце трапіць пад клеймаваньне антысэмітам гэтак жа лёгка, як у Беларусі пад кляймо апазыцыянэра. Дастаткова замест агульнай незадаволенасьці парадкам рэчаў публічна пасунуцца да канкрэтыкі. А канкрэтыка гэтая, калі гаворым пра Блізкі Ўсход, простаму эўрапейцу трохі вядомая.

Людзей ня могуць ня ўражваць гэткія дэталі акупацыйнага побыту, як забарона вернікам наведаць у час Рамадану мячэты ў Ерусаліме, — дазволена толькі сямейным мужчынам і жанчынам, старэйшым, адпаведна, за 45 і 35 гадоў. Западаюць у памяць змрочныя асаблівасьці ізраільскае паўсядзённасьці — браніраваны школьны аўтобус, дзякуючы якому габрэйскія дзеці не загінулі ад выбуху міны.

На гэта зважаюць людзі інфармаваныя, схільныя да аналізу, менш падатныя на прымітыўную прапаганду. Хіба таму гэтак згодна выглядае стаўленьне да зьвышмагутных і зьвышнадзейных Злучаных Штатаў і маленькага неспакойнага Ізраілю — больш адукаваныя людзі ставяцца да абодвух больш крытычна: прыкладна дзьве трэціны ў параўнаньні з паловай сярод менш адукаваных.

Уважлівы чалавек заўважыць у стракатай плыні адмову групы ізраільскіх *вайсковых* лётчыкаў удзельнічаць у ракетных атаках для зьнішчэньня радыкальных палестынскіх дзеячоў. Цікаўны даведаецца пра пратэсты высокіх вайскоўцаў Ізраілю супраць жорсткага курсу ўраду і пра гнеў Шарона з прычыны неафіцыйнага мірнага пляну, складзенага габрэйскімі і арабскімі палітыкамі, бо той прадугледжвае саступкі палестынцам у пытаньні пасяленьняў і статусу Ерусаліму. І гэткі чалавек не пагодзіцца, што жорсткасьць да арабскага народу Палестыны аўтаматычна выбачаецца з прычыны Галакосту. Як разважлівы беларус ня верыць, што ва ўсіх праблемах нашае гаспадаркі вінавата адно «разрыў сувязяў» пасьля распаду СССР.




JERUSALEM.INDYMEDIA.ORG

**Буру выклікалі вынікі сацыялягічнага апытаньня, зладжанага «Эўрабаромэтрам». На пытаньне, якія краіны ствараюць пагрозу міру ў сьвеце, большасьць эўрапейцаў адказала — Ізраіль.**

Апытаньне «Эўрабаромэтру» зафіксавала добра знаёмую беларусам агульную незадаволенасьць большасьці. Малая краіна пад крылом гіганта, трымаючы сьвет у напружаньні, паўстагодзьдзя імкнецца пашырыць заваяваныя землі. Палітыкі зжыліся з гэтаю праблемай настолькі, што амаль не ўяўляюць яе сапраўднага выгляду. Прызвычаіліся, як да чалавека зь непрыгожым тварам, — цяперака бядуюць, што нехта нахабна назваў яго крываносым.

«Голас народу — голас Бога з машыны!» — кпіў адзін з герояў Караткевіча. Відаць з усяго, меркаваньне, уласьціваe палітыкам увогуле, інакш яны б не мітусіліся кожны раз, калі народ нешта вымавіць *сам* (ці амаль сам, улічыўшы немалую працу сацыёлягаў) — і, як заўсёды, ня ў лад.

**Аляксандар Карольчык**

ЭЎРАІНТЭГРАЦЫЯ: ПОЛЬСКІ ДОСЬВЕД

## Эўрапейскія пэрспэктывы сельскай гаспадаркі

Ужо дзясяткі гадоў датацыі сельгасвытворцам складаюць амаль палову эўрабюджэту. У гэтай галіне працаўладкавана 5% прафэсійна актыўных асобаў, а сельгасплошчы складаюць каля чвэрці тэрыторыі краінаў ЭЗ. Як у гэтых умовах дадуць рады польскія фэрмэры? Адказвае намесьнік міністра сельскай гаспадаркі Польшчы Ежы Плева.

**— Якія пэрспэктывы мае польская сельская гаспадарка пасьля далучэньня краіны да ЭЗ?**

**Ежы Плева:** Калі Польшчы ўдасца ажыцьцявіць усе неабходныя рэформы, у тым ліку своечасова збудаваць Інтэграваную сыстэму маніторынгу і кантролю сельскай гаспадаркі (з ангельскай IACS), у польскую вёску трапіць у два з паловай разы больш сродкаў, чым цяпер.

**— Фэрмэры вельмі баяцца далучэньня да Эўразьвязу. Як выглядае працэс папулярызацыі ідэі эўрапейскай інтэграцыі ў вёсцы?**

**Е.П.:** Жыхары польскай вёскі не давяраюць зьменам. Выразная зьмена ў стаўленьні фэрмэраў да інтэграцыі будзе відавочная тады, калі яны атрымаюць першыя сродкі ды скарыстаюцца імі ў якасьці інвэстыцыяў.

**— Як выглядае праблема беспрацоўя ў вёсцы?**

**Е.П.:** Гэта балючая праблема. У вёску трэба прыцягнуць інвэстыцыі, палепшыць стан вясковай інфраструктуры. Пасьля далучэньня Польшчы да ЭЗ пачнуць дзейнічаць новыя праграмы. Напрыклад, праграма насаджэньня лясоў, якой змогуць скарыстацца фэрмэры, што абрабляюць няўдобіцы. Спэцыяльныя праграмы падтрымкі прадугледжваюцца таксама для дробнатаварных гаспадарак, якіх у Польшчы шмат. Ужо дзейнічае праграма «структурных пэнсіяў» (пэнсіі для фэрмэраў, якія вырашаць адмовіцца ад сваіх невялікіх гаспадарак). Трэба ўспомніць таксама пра падтрымку для экалягічных гаспадарак.

**— Ці польская сельская гаспарадка канкурэнтаздольная на эўрарынку?**

**Е.П.:** Ад 1 траўня 2004 г. зьнікнуць дадатковыя бар’еры ў гандлі (напрыклад, мінімальныя цэны), і Польшча зможа больш эфэктыўна экспартаваць на эўразьвязаўскі рынак сваю садавіну й гародніну. Што тычыцца збожжа, дык Польшча ніколі не была тут асаблівым экспартэрам. Наадварот, яна імпартавала пшаніцу. Таму асаблівых зьменаў ня будзе. Усе вытворцы збожжа, алеевых расьлінаў і г.д. атрымаюць даплаты.

Праблемы могуць назірацца ў сэктары перапрацоўкі. З далучэньнем да ЭЗ Польшча будзе вымушаная прыняць вонкавую мытную стаўку на сельгаставары. На алькаголь, хлеб, кандытарскія вырабы польская мытная стаўка большая, чым эўразьвязаўская. Значыць, трэба будзе змагацца з канкурэнцыяй.

**— Узровень непасрэдных даплатаў для фэрмэраў залежыць ад сродкаў, выдаткаваных на гэта зь бюджэту дзяржавы. Ці польскія фэрмэры атрымаюць даплаты ў максымальным памеры?**

**Е.П.:** Спачатку Эўразьвяз увогуле не прадугледжваў даплатаў для краінаў-кандыдатак. На апошнім этапе перамоваў была прынятая польская прапанова перасунуць на непасрэдныя даплаты сродкі з эўразьвязаўскага бюджэту й частку сумаў, якія ня будуць выкарыстаныя на разьвіцьцё вясковых тэрыторыяў. Цягам першых трох гадоў даплаты з ЭЗ складуць 40%, надалей могуць вырасьці да 55, 60 і 65%. Гэтая розьніца мае быць фінансаваная зь дзяржаўнага бюджэту. Кожная краіна сама будзе вырашаць, ці выдаткоўваць на гэта сродкі.

Ня ўсе ведаюць, як выглядае працэдура выплаты. Спачатку ўсе даплаты пералічваюцца зь дзяржаўнага бюджэту, і толькі пазьней ЭЗ вяртае гэтыя сродкі з сваёй касы.

Прэм’ер Мілер гарантаваў, што ўзровень даплатаў, зацьверджаны ў Капэнгагене, — рэальны. Тым часам нават гэтая сума меншая за ўзровень даплатаў, якія атрымліваюць фэрмэры з краінаў ЭЗ. Тым ня менш, канкурэнтнасьць большай часткі польскіх гаспадарак пры гэтым памеры даплатаў будзе гарантаваная.

**Ганна Дамбкоўская,**
Беларуская служба радыё «Палёнія»

# Крыж па генэралу Цікоту



На здымку: архімандрыт Сяргей Гаек асьвячае крыж

**1 лістапада ў мястэчку Жодзішкі, што на Смаргоншчыне, адбылося ўрачыстае асьвячэньне помніка ў гонар Андрэя Цікоты, уніяцкага сьвятара, генэрала Ордэну марыянаў.**

Нарадзіўся будучы супрыёр Друйскага кляштару марыянаў на хутары Плавушка. Непадалёк быў фальварак Тупальшчына, адкуль паходзіў яшчэ адзін славуты сын смаргонскай зямлі Юльян Бакшанскі, кіраўнік паўстанцкага атраду ў 1863 г., які загінуў у баі 4 красавіка ля вёскі Плябань (Маладачаншчына). На магіле палявога камандзіра і аўтара знакамітай «Адозвы да смаргонскіх сялян», за якую расейская ўлада ў 1847-м засудзіла была яго на дванаццаць гадоў катаргі, быў усталяваны помнік. Сучасныя вандалы, на жаль, зьбілі з каменя памятную дошку, так што помнік цяпер безыменны. Ад колішняй сядзібы ў Тупальшчыне засталіся толькі рэшткі падмурку. На месцы фальварку цяпер калгаснае поле. А вось хата сям’і Цікотаў у суседняй Плавушцы зьберагласся. На Жодзішкаўскіх могілках удалося адшукаць магілу Фэлікса Цікоты (1887—1952), старэйшага брата ўніяцкага архімандрыта. Пра Фэлікса Цікоту вядома, што ён таксама быў удзельнікам беларускага руху. Узьнікла ідэя ўсталяваць побач сымбалічны крыж, паколькі месца пахаваньня Андрэя Цікоты невядомае. У сьнежні 1948 г. ён разам зь іншымі сьвятарамі быў арыштаваны кітайскімі ўладамі і перададзены СССР. Згінуў Андрэй Цікота, як і Адам Станкевіч, у Тайшэцкім савецкім канцлягеры.

Аўтарам памятнага крыжа ў гонар Андрэя Цікоты стаў гарадзенскі каваль-мастак Юрась Мацко. Яго калега скульптар Уладзімер Панцялееў выканаў на камені барэльефную шыльду. Колькі месяцаў таму гарадзенскія грэка-каталікі ўсталявалі помнік. А на Дзяды адбылося ўрачыстае асьвячэньне знака. Акрамя гарадзенскай уніяцкай суполкі прыехалі грэка-каталікі зь іншых рэгіёнаў на чале з апостальскім візытатарам архімандрытам Сяргеем Гаекам. Пасьля асьвячэньня крыжа ён разам зь мясцовым ксяндзом адправіў імшу ў Жодзішкаўскам касьцёле. Гэты храм (колішні кальвінскі збор) знакаміты тым, што ў ім зьберагліся абразы, напісаныя Пётрам Сергіевічам. Мясцовы люд прыязна паставіўся да ўніяцкіх літургічных сьпеваў і казані па-беларуску. Апостальскі візытатар паведаміў, што Ватыкан ужо распачаў працэс бэатыфікацыі Андрэя Цікоты.

Дадам, што помнік Андрэю Цікоту — ужо другі мэмарыяльны знак, усталяваны гарадзенскімі грэка-каталікамі. У 1998 г. у Альбярціне, што пад Слонімам, быў усталяваны крыж у гонар місіі Антона Неманцэвіча, якая мела на мэце адраджэньне Уніі ў Заходняй Беларусі. У наступных плянах гарадзенскай уніяцкай суполкі ўшанаваньне памяці Фабіяна Абрантовіча.

**Уладзімер Хільмановіч, фота аўтара**

# Гарбуль з паўстанцкага роду

**Продак сп.Алеся, Мацей Гарбуль, удзельнічаў у паўстаньні 1831 г. Заможным чалавекам быў, валодаў ці не паловай Лынтупаў, а пасьля падзяліў сваю зямлю паміж сынамі. Адзін зь іх, Марцін Гарбуль, ваяваў за Каліноўскага ў 1863-м. Дзед Алеся Гарбуля Рыгор у пачатку XX ст. таксама быў сябрам беларускіх арганізацыяў, дасылаў допісы ў «Нашу Ніву»…**



Каля самай літоўска-беларускай мяжы на Пастаўшчыне ляжыць мястэчка Лынтупы. Беспрацоўе і мізэрныя заробкі ў «сельскагаспадарчым вытворчым каапэратыве «Блакітныя азёры» гоняць лынтупцаў у белы сьвет. Калісьці быў зьехаў за мяжу і Алесь Гарбуль — мясцовы апазыцыянэр, паэт і краязнавец. Але вярнуўся. Цяпер актыўна займаецца экалёгіяй, рыхтуе кніжку, працуе «простым калгасьнікам».

У сярэдзіне 1990-х лынтупскія апазыцыянэры хацелі паставіць помнік паўстанцам Тадэвуша Касьцюшкі, у аддзелах якога было шмат мясцовых жыхароў. Але ўсталяваць помнік не дазволілі ўлады.

Шыльду ад яго і сёньня захоўвае Алесь. А помнік мясцовыя актывісты Саюзу палякаў паставілі на магілах пасьляваенных антысавецкіх паўстанцаў — «зялёных», закатаваных пад Паставамі.

### «Вожык» дапамог

Усе продкі Алеся Гарбуля паходзяць адсюль, з Лынтупшчыны. Але так здарылася, што сам ён нарадзіўся ва Ўкраіне — у Роўне: «Маці вучылася ў Растове-на-Доне, і, калі цяжарная вярталася дадому, я ў дарозе і нарадзіўся». Пасьля школы і войска Гарбуль скончыў вайсковы тэхнікум, дзе рыхтавалі падводнікаў. Служыў ва Ўладзівастоку.

Яшчэ ў войску ў Алеся Гарбуля адкрыўся талент паэта. Але пісаў ён па-расейску. Пісаў пра мора, нават калі вярнуўся на Пастаўшчыну. Вершы друкаваў у раёнцы. Гэтую ягоную творчасьць неяк высьмеяў «Вожык». Сорамна стала Гарбулю, і ён за год дасканала вывучыў беларускую мову. Да гэтага часу згадвае, як у 1992 г. чытаў свае беларускія ўжо вершы на радыё.

Пры канцы 80-х пастаўцы Алесь Гарбуль і Міхась Гіль заснавалі літаратурны гурток «Сьвітанак», зь якога і пачаўся мясцовы нацыянальны палітычны рух. Праўда, Гарбуль плянаваў стварыць арганізацыю экалягічнага кірунку, але Гіль настаяў, што час ісьці ў палітыку. Так паўстала першая на Пастаўшчыне суполка БСДГ. «У 1994-м у мяне ўзьніклі разыходжаньні з кіраўніцтвам Грамады, — успамінае Гарбуль. — Большасьць партыяў падтрымалі на прэзыдэнцкіх выбарах Пазьняка, а сацыял-дэмакраты — Шушкевіча. Я лічу, што гэта быў раскол. Тады, не выходзячы з Грамады, я стварыў на Пастаўшчыне арганізацыю БНФ». Па ўсёй краіне з БНФ ішоў адток людзей, а да Гарбуля за год запісаліся сто новых сяброў. Рэпрэсіяў не давялося чакаць доўга. У 1996-м пастаўскія актывісты засталіся бяз працы. Першы ўдар быў нанесены па лідэру — Гарбулю.

### З Чэхіі ў «Блакітныя азёры»

Працаваў ён тады на мясакамбінаце, спэцыялістам халадзільных установак. Пасьля страты працы нідзе на Пастаўшчыне ўладкавацца ня здолеў. Чалавека выціскалі на эміграцыю, спадзеючыся, што безь яго аслабне і мясцовы апазыцыйны рух. Гарбуль спачатку працаваў у Расеі, пасьля паехаў па кантракце ў Чэхію.

Паўгоду быў у Паўночнай Маравіі. «Трошкі пажыў у раі», — успамінае сп.Алесь пра тыя часы. Працаваў ён у лесе, у фірме па рамонце ліфтоў, удзельнічаў у ліквідацыі наступстваў паводкі: «Першы заробак атрымаў нават большы, чым чэхі, што працавалі са мной. Думаў, будуць зайздросьціць, а яны радаваліся, што я добра зарабіў!»

Гарбуль ня стаў прасіць палітычнага прытулку, вярнуўся на Бацькаўшчыну. Настальгія не давала спакою. Па вяртаньні вырашыў зьмяніць тактыку, стараўся лішні раз не «сьвяціць» перад уладамі людзей. Пасьля расколу БНФ з партыі выйшаў (але ў Грамадзе застаўся). Займаўся бізнэсам — пераганяў машыны зь Літвы, прадаваў іх у Віцебску і Менску. Пасьля расейскага абвалу 1998-га бізнэс давялося прыкрыць. Пайшоў працаваць у СВК «Блакітныя азёры».

Гарбуль захапляецца краязнаўствам, выдаў кнігу пра паганскія камяні Пастаўшчыны. Літоўскі навуковец Вікантас Вайткявічус ня мог паверыць, што яе напісаў «просты калгасьнік».

У 2000—2001 г. сп.Алесь выдаваў у Лынтупах сваю газэту — «Беражніца». У апошні час спраўдзіў урэшце сваю мару: зьвярнуўся да экалягічных праектаў. Заснаваў краязнаўча-экалягічны клюб «Нальшчаны», ратаваў ад забруджаньня рэчку Лынтупку. На ёй калісьці быў млын, які ў вайну ўзарвалі савецкія партызаны. Аднак засталася плаціна, якая прыкрывала Лынтупку ад адстойніка сьпіртзаводу. Пару гадоў таму старая плаціна пачала прапускаць атруту ў рэчку. У Лынтупцы зьнікла фарэль. «Нальшчаны» арганізавалі аднаўленьне плаціны, разам зь мясцовымі школьнікамі, настаўнікамі ды пры дапамозе кіраўніцтва заводу. А нехта з падлеткаў вывеў на яе падмурку: «Жыве Беларусь!»

**Алег Тачоны**

# Бразыльска–індыйскае рэха

У кастрычніку Рэспубліканскі тэатар беларускай драматургіі прэзэнтаваў «дэтэктыў плюс…» у 2 дзеях «І рэха адказала — ты (Ляфантэн)». Спэктакль пастаўлены Валер'ем Ласоўскім паводле п'есы Андрэя Карэліна. Пастаноўка гэткая ж грувасткая, як назва. Завязка француская, разьвіцьцё падзеяў бразыльскае, а кульмінацыя й разьвязка індыйскія. Маецца й «пасьляслоўе» ў стылі амэрыканскага кіно, дзе гледачам тлумачыцца, хто вінаваты й што рабіць.

Цнатлівая савецкая дзяўчына кажа каханаму, што ў іх будзе дзіця. Шчасьлівы бацька гоніць матацыкл, бы шалёны, і героі трапляюць у аварыю. Хлапец ляжыць у бальніцы непрытомны, яму адымаюць руку. Тым часам яго каханая Ліза (Ганна Арыніч-Анісенка) знаёміцца з заможным швэдам (Валеры Ласоўскі) і выходзіць замуж. У Швэцыі Ліза-Эльза нараджае дачку Эўропу (Вольга Водчыц). Тая падрастае, вучыцца на мастачку, знаходзіць сябра Аляксандра, які пасьля загадкава гіне. Эўропа спрабуе рэзаць вены, Швэд мяняе прыгожыя кашулі ды пагульвае з пакаёўкай Ізольдай (Ганна Палупанава), Эльза нудзіцца, а прыгажуня Ізольда проста хоча ўсіх жорстка «зрабіць», бо любіць гома-гетэрасэксуальней і даччына-сястрынскай любоўю. Яна ж — тое самае дзіця Эльзы і няўдалага матацыкліста, якое маці аддала ў швэдзкі прытулак, а пасьля «наняла» пакаёўкай. А Эўропа — дачка ад Швэда...

Усё вырашаецца ў адзін вечар. Эўропа запрашае на вячэру новага сябра Жана, саракагадовага садоўніка з каледжу, а бацька чакае ў госьці прадстаўніка важнага «…энтэрпрайзу». Не пасьпявае эфэктны Жан (Сяргей Пракопіч) пераступіць парог, як Эльза губляе прытомнасьць. Садоўнік выяўляецца і «прадстаўніком», і бацькам Ізольды, які атрымаў супэрсучасны пратэз і зрабіўся прадстаўніком вядомай артапэдычнай фірмы. Мае ўласны дом на ўзьбярэжжы акіяну. Швэда ён зьбіраецца пусьціць па сьвеце, а жонку й Эўропу (думае, што гэта яго дачка) забраць да сябе.

І тут пачынаюцца грымоты, дождж, патоп і, нарэшце, сьнег. Героі адрэзаныя ад цывілізацыі. Напружаньне расьце, гучаць стрэлы, на сцэне адбываецца вакханалія дыялёгаў кшталту:

— Ты мой тата?

— Не, я ня твой тата. Я мужчына бяз твару ў белай кашулі. Паедзем да мяне ў домік ля акіяну.

Адчувальна не стае музыкі з індыйскіх фільмаў. Бацька знаходзіць дачку, дачка — сястрычку, айчым — падчарку, сірата дазнаецца пра бацькоў. Так і чакаеш з асьцярогай, што зараз выскачаць і дзядуля з бабуляй. Нехта прапануе прасіць прабачэньня. Просяць доўга, адказна. Працяглы лямант павінен, відаць, сымбалізаваць адчай і гібель гэтых дробных грэшнікаў. Але й на тым сьвеце героі граюць немалы маралізатарскі кавалак. І рэха ім дапамагае.

**Для каго спэктакль.** Для загартаваных лаціноамэрыканскімі сэрыяламі. Альбо для тых, хто сумуе па старых добрых індыйскіх фільмах.

**Выснова.** Калі Радзіме спатрэбяцца сэрыялы ўласнай вытворчасьці, яна будзе ведаць, да каго зьвярнуцца.

**Марыя Салаўёва**



**Пастаноўшчык і адначасова выканаўца ролі заможнага швэда Валеры Ласоўскі**

ДЫСКАГРАФІЯ

# Сойка




Аляксандра і Канстанцін, 2003

У другім альбоме музыкі вырашылі цалкам адмовіцца ад перапевак блюзавых стандартаў. На кружэлцы можна пачуць дзевяць народных і адну аўтарскую песьню. Сваю разынку — мінімалісцкае гучаньне — «А & К» пакінулі. Загалоўная песня «Сойка» выконваецца толькі пад плясканьне ў ладкі, «Сена», што сёлета ўзяла прыз за найлепшую аранжыроўку на фэстывалі казахскай песьні ў Астане, — толькі пад акустычную гітару. У трох песьнях можна пачуць скрыпку Карэна Карапецяна («Крыві», «Харлі»), гітару і бубны Віктара Маўчанава, флейту й сітар італьянскага музыкі Люцыяна Весялоўскага. На «Едзе сястра к брату» падыграў акардэаніст «Леприконсаў» Уладзімер Федарук.

Па добрай завядзёнцы на альбоме айчыннага выканаўцы можна знайсьці кліп. Відэашэраг да песьні «Пчолка» быў зьняты на сьвітанку пасьля Купальскае ночы на рацэ Іслач пад Ракавам.

**Сяргей Будкін**

# Пісьменьніца — ліцэістам

Празаік Марыя Вайцяшонак перадала навучэнцам Беларускага ліцэю 23 асобнікі сваёй апошняй кнігі «Сад нявіннасьці». Ліцэісты, як вядома, працягваюць займацца з сваімі настаўнікамі па хатах, нягледзячы на рашэньне ўладаў аб расфармаваньні калектыву.

**МБ**

ГАЗЭТНЫ ШАПІК

# Мальдзісавы кладачкі



Пачынаючы ад №8, газэта «Новы час» друкуе мэмуары прафэсара Адама Мальдзіса. Яны ў нечым падобныя да ягоных гістарычна-культурных працаў: багатыя на дэталі, апісаньні і родных падвіленскіх Расолаў, і сталічных акадэмій, але стрыманыя ў ацэнках мінулага. Найлепшы знаўца беларускае мэмуарнае літаратуры ўплятае ва ўласныя мэмуары сэнсацыйныя нітачкі, цягнучы за якія, выцягваеш усю ягоную эпоху.

Чарговыя часткі ўспамінаў будуць прысьвечаныя Ўладзімеру Караткевічу ды Ларысе Геніюш.

# У чаканьні грунтоўнае кнігі

**Рыгор Крушына. Цымбаліст:** Вершы. — Менск: «Беларускі кнігазбор», 2003




Чытаю «Эротаву іскрыпку». Рымы, рытм, эўфанія такія, што я пачынаю расьцягваць словы, сьпяваць. І раптам страфа:

Любоўнай лірыкай сагрэты,
Прывычку дзіўную займеў:
Паэму лепшага паэты
Чытаў уголас, нараспеў.

Мусіць, Рыгор Крушына, аўтар «Эротавай іскрыпкі», здагадваўся, што нехта будзе ледзь не сьпяваць ягоныя вершы, і вырашыў падлавіць чытача, уставіўшы гэтую страфу, нібыта й пра лірычнага героя пісаную.

А калі чытаеш «Кантату самотных», міжволі згадваеш Купалаву паэму «Яна і я»: і там, і тут — паяднанасьць вобразаў каханае Беларусі і каханае жанчыны. І ці ведаў Васіль Сёмуха, што ў беларускай паэзіі ўжо ёсьць перастварэньне «Песьні песьняў» Салямона, калі браўся за яе пераклад?

Даты цікавыя: «Песьня песьняў» загучала па-беларуску ў 1947-м, «Эротава іскрыпка» — у 1948-м, «Кантата самотных» — у 1951-м, «Паэма пра вусны» — у 1955-м. Пра што тады пісалі беларускія савецкія і падсавецкія паэты? І хто гэта зь іх мог напісаць цыкл «Вершы з Капры»?

Я раніцою ў белай вілі
Адчуў усё: і кветак пах,
І рыбы смак, што налавілі,
І сілу сьвежасьці ў руках,

І кіпень песьні ў кіпарысе,
І ў сонным моры сонца ўсход...
Душа, жаданьням пакарыся,
Вядзі мяне ў блакітны грот.

На лёгкім чоўне з сыньярынай
Мы паплывем паўзь берагі
З імкненьнем, з мэтаю адзінай
Убачыць сёньня сьвет другі,

Прыгожы сьвет, гульню прыроды,
Пячору з казачным сьвятлом...

Так і чую голас тагачаснага савецкага крытыка: безыдэйнасьць, эстэцтва, буржуазнае разлажэньне... Дый фармаліст гэты Крушына: у кнізе «Сны і мары» за «Санэтам» ідзе «Трыялет», за ім — «Трыялет рапалічны», «Вілянэль», «Канцона», «Рандо», «Актава», «Сэкстына», «Японскія танкі», «Хай-кай: Паўтанкі»... Паэзія ў БССР, сама таго не ўсьведамляючы, даганяла гэтага эмігранта.

Загадкавы Рыгор Крушына, ён жа Рыгор Казак, бебурнац, адзін зь фігурантаў пасквіляў, што выходзілі з-пад пёраў партыйных публіцыстаў. Крушына, які нарадзіўся ў Бязьверхавічах, што непадалёк ад Слуцку (адтуль і Рыгор Мурашка). Я пачуў гэтае імя ў сярэдзіне 1960-х у Слуцку. Мой настаўнік Рыгор Родчанка (ён перапісаў для мяне Жылкаў «Тастамант») апавядаў пра «забароненых» песьняроў Случчыны. А потым мне пашчасьціла вяртаць паэта на Радзіму, друкаваць яго вершы ў яшчэ тонкай «Крыніцы». З таго часу не адзін літаратуразнаўца на Бацькаўшчыне пісаў аб Р.Крушыну, а кніга ягоных твораў так і не даходзіла да шырокага айчыннага чытача.

І вось яна выйшла, кніжачка «Цымбаліст» з прадмоваю Міхася Скоблы. (Толькі з адным сказам я не згаджуся — пра тое, што, калі б выйшаў грунтоўны аднатомавік, «беларуская літаратура пабагацела б яшчэ на аднаго паэта». Беларуская літаратура — ня тое, што пісалі пра яе пад кіраўніцтвам ЦК КПБ. І Р.Крушына быў у ёй прысутны. Іншая справа — даступнасьць ягоных твораў.) М.Скобла сказаў пра паэту натхнёнае слова. Аднак жа зьмест кнігі ня цалкам адпавядае таму, што напісана ў прадмове: няма ў ёй ані «Лебедзі чорнае», ані паліндрому, ані «Сьлёзаў сьліваў»... Аматары вэрсыфікацыйных вынаходак расчаруюцца, хоць у зборніку нямала добрых твораў. Хтосьці вырашыў друкаваць у ім толькі тыя вершы (іх дваццаць), якія сам аўтар пераклаў на расейскую. Мусіць, гэта рабілася дзеля таго, каб яшчэ раз давесьці вядомую ад часоў Максіма Багдановіча праўду: ніводнаму беларускаму паэту не ўдавалася дараўнаць у самаперакладах арыгіналу. А можна было б замест гэтых перакладаў надрукаваць яшчэ 20 ці больш арыгінальных твораў.

Прывітаўшы першы зборнік Р.Крушыны на Бацькаўшчыне, мы застаёмся ўсё ж у чаканьні ягонае грунтоўнае кнігі.

**Анатоль Сідарэвіч**

# Аіда не старэе



«Аіда», пастаўленая яшчэ ў 1951 г. Ларысай Александроўскай, у кастрычніку прайшла ў трохсоты раз. У паўнюткай залі, з новымі выканаўцамі.



**Руднева з такою моцай разыграла трагедыю фараонавай дачкі, якая ўласнымі рукамі зьнішчыла каханага чалавека, што гэтая трагедыя нечакана заступіла ўсе астатнія падзеі опэры. Пры гэтым артыстка здолела яшчэ й прадэманстраваць бездакорны вакал.**

Гала-канцэрт у Опэры — гэта жыцьцё ў мініятуры. Спаборніцтва ўсіх з усімі за права застацца ў сэрцах слухачоў. Артысты, як пеўні, па чарзе распускаюць пер’е сваёй абаяльнасьці і таленту. А пад заслону ўсе яны — пераможцы і аўтсайдэры — разам зьбіраюцца на сцэне, каб сымбалічна сьцьвердзіць сваё яднаньне ў мастацтве, у пераможным сьвятле ісьціны, прыгажосьці і дабра. Тэатар ператвараецца ў тое, чым ён быў ад пачатку, — у сьвятыню. І ўсе, хто там ёсьць, узрушаныя ўрачыстасьцю хвіліны, спазнаюць цуд пераўвасабленьня ў адну вялікую, шляхетную душу. Самы час засьпяваць нешта ўсім знаёмае, натхняльнае, з чым пойдзеш дахаты і доўга яшчэ будзеш пачувацца так, нібыта цябе прычасьцілі і блаславілі.

У эўрапейцаў ёсьць для гэткіх мэтаў Бэтховэнава «Ода да Радасьці» — «Абдыміцеся, мільёны!». Яе выкарыстоўваюць як неафіцыйны гімн Эўразьвязу. Ёсьць таксама хор палонных габрэяў з опэры «Набука»: з гэтай мэлёдыяй на вуснах змагары за вольную Італію ішлі калісьці на барыкады. Расейцы замест свабоды ўслаўляюць самадзержцаў. Міхаілу Глінку, як аўтару опэры «Жыцьцё за цара», цар прабачыў шляхецкае беларускае паходжаньне. Аднак праз 170 гадоў нечакана высьветлілася, што Глінкава «Патрыятычная песьня», якую за часамі Ельцына выкарыстоўвалі ў якасьці дзяржаўнага гімну, насамрэч зьяўляецца апрацоўкаю старажытнага каталіцкага ліцьвінскага канту.

Самі ліцьвіны-беларусы сваіх кантаў даўно не сьпяваюць. За саветамі разам з усімі паняволенымі народамі сьпявалі пад заслону «Ленин всегда живой». А пазьней у музэях, філярмоніях і дзяржтэатрах гучала «Застольная» з «Травіяты» ці ўжо згаданы хор габрэяў з «Набукі» — патрыятычныя студэнты адгукаліся дзесяцігвілінай авацыяй, крычалі «Жыве Беларусь!». Здаралася, сьпявалі палянэз Агінскага «Разьвітаньне з Радзімай» на словы Сокалава-Воюша і плакалі па Беларусі, як па нябожчыцы. Дзе цяпер тыя хлопцы ды дзяўчаты? Хто ў Польшчы, хто ў Швэцыі. Бо разьвітаньне з радзімай!

Цяперака музыка зноў зьмянілася — але зусім ня ў бок узьнёслых грамадзкіх ідэалаў і сацыяльнага аптымізму. На заканчэньне канцэрту «Любімыя арыі» 14 кастрычніка хор і салісты Опэры засьпявалі пачатковы фрагмэнт з араторыі Карла Орфа «Карміна Бурана» — «О, Фартуна, быццам Месяц ты пераменлівая...». Выконваўся ён на сярэднявечнай лаціне. Канфэрансьерка Маргарыта Захарыя на свой спосаб растлумачыла слухачам ягоны зьмест: зорнае неба, прыўкрасная багіня лёсу, спадзяваньне на лепшую будучыню... І слухачы гэткаму тлумачэньню паверылі ды з энтузіязмам пляскалі ў далоні.

Хоць калі б прыслухаліся ўважлівей, дык пачулі б у музыцы нешта іншае: «...гэта ня колы і не каруселі Фартуны, а жорны тае пякельнае машыны, якая зьнішчыла ў XX ст. незьлічоную колькасьць людзей». Так піша пра пачатак «Карміны Бураны» нямецкі кампазытар-антыфашыст Курт Вайль. Нездарма твор быў напісаны ў 1937 г., калі ў СССР раскручваўся махавік рэпрэсіяў, а ў фашысцкай Нямеччыне былі пабудаваныя першыя канцлягеры.

Публіка гэтага не адчула. Яна паступова губляе чуйнасьць да праяваў таталітарызму і гвалту. Большасьць гатовая апляддаваць грубай, непераможнай сіле, якую намаляваў у сваім творы Карл Орф. Куды падзеўся той ідэалізм, тая душэўная безабароннасьць, якая ў свой час спарадзіла цудоўную опэру «Дзікае паляваньне караля Стаха»? Ад рамантыкі не засталося нават сьледу. А да самой опэры, хоць яна і захоўваецца ў рэпэртуары, ставяцца як да муміі: ажывіць немагчыма, а выкінуць нельга.

Апошнім разам «Дзікае паляваньне» прэзэнтавалася 16 кастрычніка, пасьля паўтарагадовага перапынку. Пераважная большасьць выканаўцаў — гэта вэтэраны, якія бязьзьменна выконвалі свае ролі ўсе чатырнаццаць гадоў пасьля прэм’еры. Аднак зьявіліся і новыя твары: Аляксандар Жукаў у ролі Андрэя Сьвецiловіча і Аляксандар Дрынеўскі ў ролі Вароны. Абодва пакуль не дацягваюць

> Выратаваць грамадзтва ад распаду можа толькі дух гераізму, пры адсутнасьці якога палітычныя інстытуты — гэта мяса бяз солі, карона — цацка, царква — проста ўстанова, парлямэнт — дыскусійны клюб, а ўся цывілізацыя — сон, што хутка пралятае.

да сваіх папярэднікаў. Жукаў — ад прыроды выдатны тэнар — вось ужо дзесяць гадоў «выціскае зь сябе вераб’я», у якога ператварыла яго навучаньне ў Беларускай акадэміі музыкі. Дрынеўскаму выразна не хапае сцэнічнага досьведу. Скончыўшы ў 1998 г. (з выдатнай адзнакаю!) усё тую ж Акадэмію музыкі, ён пяць гадоў працаваў у опэрным хоры і толькі сёлета перайшоў у салісты — пасьля таго як з посьпехам выканаў загалоўную ролю ў опэры «Князь Ігар». Няўжо ў нас процьма добрых барытонаў, каб пэрспэктыўнага хлопца пяць гадоў марнаваць у хоры? Напэўна ж не — іначай адказную партыю Набукі выконвалі б пяць розных сьпевакоў, а не адзін пэнсіянэр Мікалай Майсеенка.

Аднак галоўныя праблемы не з выканаўцамі: сама опэра ўжо не трапляе ва ўнісон з настроем публікі. Нават трагічная сьмерць кампазытара Солтана, якая надае ўсім ягоным творам прысмак сьвятарнасьці, пасьпела зглядзіцца з памяці. А ў 1989-м сам вобраз Беларусі, шляхетнай і шляхецкай (а не сялянска-партызанскай), абуджаў у сэрцах сьветлую мару.

Сёньня твор Солтана-Караткевіча выклікае гэткае ж расчараваньне, якое спазнае колішняя каралева выпускнога балю, калі глядзіцца ў люстэрка і бачыць свой празаічны і паблёклы твар. Глядзіш на сцэну і раздражняешся бязвольнасьцю дзейных асобаў. Яны зусім і ня дзейнічаюць: ходзяць па сцэне, атручаныя балотным туманам, зь якога родзяцца толькі пачвары, зло і сьмерць. У гэтых людзях няма жыцьця, замест крыві ў іх жылах цяче балотная жыжка. Нават «рыцар на белым кані» (Беларэцкі), які, паводле законаў жанру, мусіць іх выратаваць, цяпер здольны толькі назіраць і быць ахвяраю.

Опэра — жанр дыдактычны. Яна мусіць — праз палымяныя пачуцьці, праз абурэньне, боль, адчай, катарсіс — навучыць перамозе. Міжволі згадваецца славутая фраза з раману «Конінгсьбі» Бэнджаміна Дызраэлі: «Выратаваць грамадзтва ад распаду можа толькі дух гераізму, пры адсутнасьці якога палітычныя інстытуты — гэта мяса бяз солі, карона — цацка, царква — проста ўстанова, парлямэнт — дыскусійны клюб, а ўся цывілізацыя — сон, што хутка пралятае».

Вось чаму беларусы любяць «Аіду». Геній Вэрдзі, які яшчэ ў 1874 г. у музыцы «Рэквіему» намаляваў жахлівыя карціны Хірасімы і дывановых бамбаваньняў, у «Аідзе» амаль дакладна прадбачыў стылістыку і характар гітлераўскіх ці сталінскіх вайсковых маршаў. А галоўнае — раскрыў самую душу чалавека, вымушанага жыць і змагацца за сваю годнасьць ва ўмовах таталітарнага рабства. Героі Вэрдзі, пры ўсёй безнадзейнасьці свайго становішча, усчынаюць барацьбу і перамагаюць — хай нават коштам свайго жыцьця.

Ня дзіва, што «Аіда» не старэе. Спэктакль, пастаўлены яшчэ ў 1951 г. «беларускай перапёлачкай» Ларысай Александроўскай, сёлета ў кастрычніку прайшоў у 300-ы раз. Прайшоў у паўнюткай залі, скрозь з новымі выканаўцамі. Як старое дрэва, якое зноў зазеляненелася маладымі атожылкамі. Цёплымі і добрымі былі тыя гаспадарскія рукі, якія яго пасадзілі, а ў нашчадкаў хапіла розуму ня выкарчаваць. Узростам беларуская «Аіда» саступае хіба толькі «Паўлінцы», якой налета споўніцца шэсьцьдзесят. Апошнім часам «Аіда» сталася гастрольным таварам: у 1994 г. яе прэзэнтавалі ў Гішпаніі (у тым ліку ў Мадрыдзе), у 1998 і 2001 — на фэстывалі ў швайцарскім Салятурне, сёлета — у Нямеччыне...

І няважна, што маладыя артысты ў нечым саступаюць старэйшым. Ніна Шарубіна ў ролі Аіды хаця і сьпявае выдатна, аднак пакуль укладае ў свой сьпеў замала душы. Асабліва гэта адчуваецца ў славутай сцэне на беразе Нілу, калі Аіда аплаквае сваю страчаную радзіму. Тутака аднымі «жарсьцямі» нічога не даб’ешся — трэба сэрцам адчуць усю глыбіню цярпеньня гераіні і засьпяваць бязь сьлёз, як сьпявалі калісьці на сваіх вясельлях дзяўчаты-сіроты: цярпеньне камянёў і травы. Гэтаксама і Андрэю Марозаву ў ролі эфіёпскага цара Аманасра не хапае «зьвераватасьці», мацёрае гушчыні голасу. З усіх навічкоў найдакладней «трапіў у яблычак» Сяргей Франкоўскі. Ягоны голас ліецца проста з сэрца. Як і голас Натальлі Рудневай, якую пакуль ніхто ня здольны замяніць у ролі Амнэрыс. Руднева з такою моцай разыграла трагедыю фараонавай дачкі, якая ўласнымі рукамі зьнішчыла каханага чалавека, што гэтая трагедыя нечакана заступіла ўсе астатнія падзеі опэры. Пры гэтым артыстка здолела яшчэ й прадэманстраваць бездакорны вакал. Вось у каго варта вучыцца нашай моладзі!

Так што «Аіда» самая беларуская з усіх італьянскіх опэраў. А калі сумняваецеся, дык купеце праграмку і паглядзеце на малюнак, якім яна аздобленая. Эгіпэцкі раб корміць хатняга жураўля дакладна гэтак, як нашыя вяскоўцы — гусей.

«Паміж пяскоў Эгіпэцкай зямлі,
Над хвалямі сінеючага Нілу...»

Цікава, ці Максім Багдановіч таксама любіў «Аіду»?

**Юлія Андрэева**

**На фота ўверсе: так выглядалі першыя пастаноўкі любага беларусам спэктаклю 50 гадоў таму. Здымкі з архіву Тэатру опэры і балету**

Славамір Адамовіч

# Лісты з

## Ліст першы. Этапы

Важна своечасова зразумець, што адзін этап твайго існаваньня ўжо завяршаецца. Калі ты захочаш затрымацца больш за адведзены тэрмін, пазбавішся радасьці й сэнсу жыцьця.
*Паола Каэльё, «Пятая гара»*

13 верасьня 2002 г., у пятніцу, на менскім чыгуначным вакзале мяне праводзілі ў дарогу тры жанчыны — Маці й дзьве любкі.

Млеў позны вечар, я быў добра паддаты, жанчыны крыху плакалі, і ў сьвятле нэонавых ліхтароў паблісквала лысінка майго спадарожніка.

Я пакідаў Радзіму. Зрабіўшы на ейных абсягах усё, што можна было зрабіць, маючы на руках толькі голы энтузіязм, ідэі і букет эмоцый; я пакідаў яшчэ не астылыя ад любошчаў лоні маіх палюбоўніц; пярэсты статак бітых і нябітых дэмакратаў з часныковым смуродам апраметнай — шчырых прыхільнікаў і вартых жалю пад'ялдычнікаў; галодных землякоў і сытую набрыдзь; відовішча плебейскага гону бязродных на землях колішняга ВКЛ; пакідаў пустапароднасьць і золата маёй Нацыі...

...16 верасьня мы з таварышам ступілі на зямлю Нарвэгіі. Восеньская сталіца Каралеўства нагадала мне старую Горадню, аднак любаваца архітэктурай і клікаць музу паэзіі не выпадала — трэба было думаць, як найлепш здацца паліцыі. Вырашылі сьпярша сустрэцца зь земляком, які ўжо трэці год «на нелегале».

Былы выпускнік Інстытуту замежных моваў, зь цяжкасьцю варочаючы ў роце валуны беларускай мовы, папрасіў нас гаварыць... шэптам. Пасьля роднага Менску, у якім за гаварэньне па-беларуску можна трапіць у міліцыю, такая просьба была ўдарам пад дых: «Як, і тут шэптам?!»

І толькі ў падпольным паддашку земляка, даядаючы сапраўдны менскі хлеб і дапіваючы апошнюю бутэльку беларускай крамнай, мы з таварышам дапялі, чаму лепей шэптам. Папросту Осла, як і іншыя гарады Эўропы, напоўнены нелегальным рабоча-крымінальным людам, і паліцыя ў цывільным пэрыядычна прарэджвае гарадзкі натоўп, выслухоўваючы іншамоўны акцэнт.

Зямляк-нелегал параіў нам здавацца ня ў Осла, а ў Крысьціянсандзе, што, на яго думку, павялічвала нашыя шанцы пазьбегнуць высылкі ў бежанскія лягеры на поўначы Нарвэгіі. Мы так і зрабілі, і ў гадзіну ночы 18-га, прыехаўшы аўтобусам у названы горад, патэлефанавалі ў дзьверы мясцовага пастарунку. Прынялі нас ветліва, забралі толькі тыя дакумэнты, якія мы ім падалі, і праз хвілін пятнаццаць адвезьлі ў гатэльчык мэтраў за дзьвесьце ад месца працы ахоўнікаў нарвэскага парадку.

Раніцай мы ня ведаю за чый кошт добра пасьнедалі, пасьля чаго нас ізноў адвезьлі ў паліцыю, дзе ўзялі адбіткі пальцаў, сфатаграфавалі і праверылі нашы торбы (праўда, не пры нас, а ў суседнім пакоі, што зьдзівіла, але было хутка забыта). Прыкладна гадзіне а 2-й дня сымпатычная паліцыянтка адвезла нас у аэрапорт, узяла білеты й прасачыла за нашай пасадкай у самалёт Скандынаўскіх авіяліній рэйсам на Осла.

У сталічным аэрапорце, зашуганыя цывілізацыйным бляскам і сытай публікай, цэлую гадзіну не маглі мы атрымаць свой багаж ды выйсьці з тэрміналу на прыпынак таксі. Нарэшце паліцыянт у цывільным убачыў нашы нетутэйшыя постаці — і мы ўздыхнулі з палёгкай: усё, далей пра наш лёс паклапоцяцца нарвэскія ўлады.

Спачатку заехалі ў транзытны лягер «Lisaker», але там не забавіліся. Завезьлі ў іншую транзытку — Танум, непадалёк ад Осла. Выдалі пасьцельную бялізну, адзеньне-абутак, туалетныя прычындалы і 450 крон на кішэнныя расходы. У чарзе на афармленьне дакумэнтаў знаёмлюся з групай маладых чачэнцаў (магчыма, гэта прадстаўнікі іншых народаў Каўказу, якія здаюцца пад чачэнцаў, як пад беларусаў здаюцца грамадзяне Літвы, Украіны, Расеі ці Малдовы, напрыклад). Праз некалькі дзён я напішу два расейскамоўныя вершы на чачэнскую тэму і падарую ім. А вось



сваім землякам я й пасьля году жыцьця *на азюлі* не магу падараваць нават двох радкоў — няма каму.

20 верасьня — важны дзень: пішам заявы на атрыманьне ў Нарвэгіі палітпрытулку...

У Тануме напісаў і першы верш па-беларуску — пра нарвэскае мястэчка Сандвіку, дзе набываў я пачак цыгарэтаў даляраў за сем, дыхаў водарам восеньскага травастою ды любаваўся белагаловай малечай у нарвэскіх дварышчах.

22-га прывезьлі партыю цыганоў. Цыганы ё цыганы: гарластыя, нахабныя, неахайныя і — сытыя не па-бежанску (дзеткі іхныя гуляюць дармавымі апэльсынамі ў футбол, то чаму ня жыць!).

Транзытнымі пунктамі прыёму бежанцаў апякуецца нарвэскі Чырвоны Крыж. Адзін зь яго кліентаў напісаў на сьцяне над часова маімі нарамі:

Пацаны
Бегите от сюда!
Вас нае…и
Работы нет
Прав нет
Бюрократия

На вячэрнім прамэнадзе перасякаюся з арабам майго веку, які аддае мне свой «добры вечар» — *алах акбар*. Ківаю ў адказ, ловячы сябе на думцы, што бацькавы гены дазваляюць мне касіць і пад араба, і пад жыда. Ня кажучы ўжо пра прадстаўнікоў іншых смуглявых народаў белай расы.

## Ліст другі. Інтэрвію

Только мне и осталось, что память одна,
Только чёрная память в стакане вина,
Да горючие песни о злобе моей,
Да весёлые письма далёких друзей.
Даже сонная боль пережитого дня,
Даже имя твоё покидает меня.
*Арсен Таркоўскі*

24 верасьня, дзясятая раніцы. Дзесьці ў Менску пачаўся зьезд пісьменьнікаў, а нас пераводзяць у чарговую транзытку — Онсруд. Лягер разьмешчаны на тэрыторыі былой ваенчасьці, абнесены калючкай. Ежа ў сталоўцы сытная, але не для беларускага жывата, прывыклага да чарнахлебіцы, сала-шынкі ды вяскова-дачных засолаў.

На сьценах новага пакою — новыя фразы: «Belaruś the best», «Слуцк 2002», «Где ты, родная Белоруссия?» ды іншыя.

Калі ў маіх землякоў патрыятычныя пачуцьці *тут* яшчэ толькі абуджаюцца, то ў мяне яны яшчэ не прыгасьлі, і я вывешваю на акно невялікі бел-чырвона-белы сьцяжок. А каля дзьвярэй — мапу Беларусі. Не для сябе — для прапаганды свайго.

29-га было яснае надвор'е: цёмна-чырвонымі гронкамі ягад гарэлі рабіны; бессаромна зеляненла густая трава ў скверыку паміж сталоўкай і адміністрацыйным корпусам; па абедзе туды-сюды сноўдалі лягернікі; віshчэлі дзеткі. Самалёты, памятаю, узьляталі зь недалёкага лётнішча і праплывалі над намі, лянотна вуркочучы турбінамі. Некаторыя кіраваліся на ўсход, па левую руку ад мяне, туды, дзе Радзіма, дзе ты, такая жаданая, сур'ёзная, гульлівая і ціхая ў маіх абдымках.

Чакаючы палітпрытулку, думаю я не пра амбарасы майго новага побыту, а пра цябе, тваё, твае, тваіх і твой — дух.

А ў чым жа ён? У маленькіх чорных вачах з кароткімі вейкамі? У няскладнай фігуры? У невялічкіх грудзях, што ўжо выкармілі не маю дачку? У вузкіх клубах і грубавата-тоўстых ікрах?

У чым жа веліч твая, што так дыханьне мне перацінае? Што ёсьць у табе такое, што цьвеліць струны мае? Няўжо валосікі твае меліраваныя, што рассыпала ты па твары, каб схаваць свой замужні сорам?

...Пазваніўшы перад самым маім адбыцьцём, зрабіла ты крок эгаістычны, жорсткі. Ты падліла жыцьцядайнай вільгаці ў амаль засохлы вазон маіх да цябе пачуцьцяў. І што ж цяпер? Ледзь-ледзь акрыяўшы, кветка маёй любові павінна зноў сьмягнуць, цяпер ужо на далёкіх і халодных скалах *Краіны Паўночнага Шляху*?

Праўда, у мяне былі і дні высокай радасьці: расквітнелы ў жніўні каштан на пр-це Скарыны, высокае неба і яблыкі ў Лошыцкім садзе,

і рукі твае, не вялікія і не малыя,
і абдымала ты імі, і абдымала мяне;
а цалавала, чаму ж гэта ты цалавала
рукі мае, што трымалі ў абдымках гадамі
целы чужыя жаночыя, а не цябе, не цябе?
радасьць экстазу, экстазу гарачыя сьлёзы
ты выплаўляла з вачэй бессаромных маіх;
гэта ня так, як здараецца пасьля наркозу,
гэта твой позірк, як нож, на якім я заціх...

Вечарам 1 кастрычніка абкурыўся гашышам, ноччу балела галава. Не спадабалася. Лепей займацца любошчамі з раскошнай афрыканкай колеру гартаванае сталі.

Добра гэта ці не, калі тваё жыцьцё — суплёт знакаў, сымбаляў, неверагодных супадзеньняў, прарочых сноў, фалічнага і вагінальнага?.. Думаю, гэта цікава. Вось хоць бы лічба 13: ходзіць, падтанцоўвае вакол мяне — 13 верасьня я пакідаю Беларусь, а 13 кастрычніка, у нядзелю, — інтэрвію ў Дырэктарace па справах іншаземцаў (UDI). Звычайна інтэрвію доўжыцца ад 15—20 хвілін да 2—3 гадзін. Але ў выпадку са мной атрымалася інакш: гісторыю сваіх адносінаў з рэжымам за адзін раз я расказаць не пасьпеў; інтэрвію прадоўжылася 21-га кастрычніка, пачаўшыся гадзіне а 10-й раніцы, а завяршылася а 9-й вечара.

Мая сьледчая, гадоў пад трыццаць рыжарабаватая маладуха ў джынсіках, час ад часу раздражняла мяне надта ж удлівымі пытаньнямі і ўдакладненьнямі. Худзенькая перакладчыца цярпліва перакладала, зрэдку сьвятлела тварам, усьміхалася і нават дазваляла сабе ўласныя рэплікі. Пасьля чарговага перапынку на каву ўсьміхнулася і маладуха: аказалася, у Інтэрнэце адшукалі мой здымак, на якім я з валасамі на галаве і гальштукам-«матыльком» на кадыку (энтузіястычны пэрыяд часоў парлямэнцкай Рэспублікі). Тады было мне гадоў на дзесяць меней, я ўжо пісаў вершы пра каханьне й родную мову, але яшчэ ня думаў забіваць прэзідэнта, не зьбіраўся ў турму, ня ведаў, што мая сьціплая канстытуцыя вытрымае восем сутак сухой галадоўкі і пасьля атакі на варожае пасольства нашу баявую групу не затрымаюць.

Вось тут, мая любая, мая галасістая, хітрая, чарнавокая, ужо з маршчынкамі на лбе, маці чужога нашчадка, мая ўжо пасьля клімактэрычнага пэрыяду, мая пасьля кесаравага сячэньня, мая Эльза, Эва Браўн, Лені Рыфэншталь (ах, ты днямі памерла на 101-м годзе

# Поўначы

жыцьця!), мая Рут, песьня Сольвэйг, Брунхільда мая, Грызэльда, сапяжанка, слуцкая бэра, лябарантка з Бараўлянаў, Валя-правізар летам 94-га, мая лесьбія, мая Энола Гей, — тут, вечнае маё жаданьне, я павінен сказаць тое, што ў разьвітальнай гарачцы не пасьпеў год назад у Менску-Беларускім.

Дык вось, мая фіялетавая, паспрабуй уявіць нашу зямлю, на якой функцыянуюць шэсьць мільярдаў чалавечых арганізмаў? Што? Складана? Згодны, уявіць гэтую біямасу цяжка: нават калі мы разварушым самы вялікі мурашнік, мы не налічым у ім і мільярда рудых работнічкаў; нават у нашым супольным роце, які зайшоўся пажадлівым пацалункам паміж другім і трэцім бакалам такайскага, бактэрыёляг ня знойдзе такой неверагоднай колькасьці бактэрый; адным словам, сьвет малы, а людзей вельмі многа; яны жывуць у межах сваіх і чужых тэрыторыяў, выспавядаюць свае рэлігіі і ненавідзяць суседзкія; вядуць пэрманэнтныя вялікія і малыя войны; прагрэсуюць і дэградуюць адначасова; над зямлёю завісае смурод гарэлага мяса ўперамешку зь бялкова-вітаміным пахам гомагенэзу; і ў менскім кінатэатры «Масква» Ганна Чарнушка з Камвольнага шчыра плача над лёсам агністага «Тытаніка». Але, мая ваўняная, ці магчыма адваротная сытуацыя, калі «Тытанік» стане румзаць над бедамі камвольшчыцы Ганны? Тады скажы, мая любая Шын Фэйн, як жа прымусіць той «залаты мільярд» з шасьці існых зьвянуць увагу на *праблему роднай школы* ў адной асобна ўзятай краіне? Як давесьці пасажырам «Тытаніку», які ўжо плыве ў водах цывілізацыі, дэмакратыі і прагрэсу, што *новыя палестыны зьяўляюцца там, дзе твайму дзіцяці даюць каляніяльную ляндрынку, але адбіраюць магчымасьць вучыцца на роднай мове*?

Кветка мая верасовая, смолка прыпяцкіх выдмаў, мая галасістая, хітрая, чарнавокая, ужо з маршчынкамі на лбе, маці чужога нашчадка, мая пасьля кесаравага сячэньня, мая Эльза, Эва Браўн, Лені Рыфэншталь (ах, ты днямі памерла на 101-м годзе жыцьця!), мая Рут, песьня Сольвэйг, Брунхільда мая, Грызэльда, сапяжанка, слуцкая бэра, лябарантка з Бараўлянаў, мая лесьбія, мая Энола Гей, — тут, вечнае маё жаданьне, я павінен сказаць тое, што ў разьвітальнай гарачцы не пасьпеў год назад у Менску-Беларускім.

Любая мая пліска Тонкі Галасок, мая Красавіцкая Кнігаўка, памятаеш, у сямнаццаць гадкоў ты пакінула сваё паўстанцкае мястэчка і паехала ў вялікі горад вучыцца. Ты была выдатнай студэнткай, потым доктаркай, маткай і жонкай. Але ўвесь гэты час, усе трыццаць гадоў твайго дарослага жыцьця, ты не была сабою. Не, ты цьмяна, ад выпадку да выпадку, адчувала, што нешта ня так, нечага вельмі істотнага не хапае ў тваім памяркоўна-стабільным жыцьці, але і ўсяго таго. Пасьля ўжо, калі пайшла ў школу дачка, калі аднавіла выхад *наша* газэта, выйшлі з падпольля патрыёты-адзінцы і група паводле нацыянальных інтарэсаў, пачало праясьняцца й тое, што бунтавала ў табе, — твая тутэйшасьць. Сустрэча са мною вярнула цябе ў маладосьць, у тваё мястэчка, вярнула мову, і ты загаварыла па-нашаму, па-тутэйшаму.

Як жа ты гаварыла! Якая гэта была велічная — тутэйшая — мова каханьня, пяшчоты, жарсьці... І я зразумеў, што нічога ня страчана, пакуль ня страчана мова, пакуль наша слова — грунт нашага духу, і што барацьбу трэба працягваць хоць бы і найперш для таго, каб мая жанчына шаптала мне словы любові на мове гэтай — нашай зь ёю — зямлі.

Кветка мая верасовая, смолка прыпяцкіх выдмаў, мне сорамна, што браў я, здаецца, больш, чым даваў табе. Але твая сіла мне так была неабходна там, куды я вяртаўся пасьля тваіх абдоймаў. Там, у кляацы грамадзка-палітычнага жыцьця, я ўсё менш і менш знаходзіў праўдзівага, дзёрзкага ды чыстага — слова, дзеяньня, думкі. З гадамі ідэя *нацыянальнага адраджэньня* ператварылася ў дамаганьне чагосьці пад назовам дэмакратыя.

Няма, здаецца, ніводнага незалежнага асяродку зь яснымі мэтамі й задачамі бягучага дня. Зародак незалежнага грамадзтва фактычна прыкормлены заходнімі фундацыямі, а бальшыня соцыюму знаходзіцца ў духоўнай і эканамічнай пастцы Ўсходу. Актыўныя, самадзейныя і самадумныя індывіды не патрэбныя сёньняшнім палітычным партыйкам. Папраўдзе, адбылася маштабная дэвальвацыя альбо падмена паняткаў, ідэй і мэтаў, напрацаваных *адраджэнцамі* да паловы 90-х, на лібэрал-дэмакратычную прынаду апошняга часу. Вэрбальныя атакі палітыкаў ператварыліся ў піск сьляпых кацянят, якіх гаспадар нясе тапіць. Лідэры робяць выгляд, што іхныя паходні гараць ясным полымем, у той час як яны дымяцца галавешкамі згарэлага нацыянальнага дому. І на кожным кроку *паразы, паразы, паразы!* А яны, як вядома, дэмаралізуюць людзей. Вось чаму, любка мая нясьвіская, мы, як ты ведаеш, зрабілі тое, што мусілі зрабіць: 30 траўня 2001 г. мы атакавалі гэтае чортава пасольства ў нашай сталіцы.

...Ідучы на акцыю, мы пакідалі дома каханых, жонак, дзяцей, некаторыя нават унукаў. Надвор'е нам спрыяла. У раёне аб'екту было амаль бязьлюдна. У салёне савецкага «жыгуля» пахла бэнзынам. Таварыш адчыніў дзьверы, сказаў, здаецца, «Ну, з богам!» і пайшоў, прыхапіўшы з сабою гранаты. Мы з шофэрам засталіся ў машыне...

Хвілін праз некалькі даволі моцна грымнула, потым яшчэ. Потым шчасьліва вярнуўся таварыш.

Пляну адыходу не было: абдумвалі яго, пакуль дварамі і бакавымі вуліцамі пакідалі месца падзеі. Ужо каля Жоўтай царквы мы зразумелі, што акцыя ўдалася і нам ня прыйдзецца адстрэльвацца і ўзрываць сябе гранатамі, калі скончацца патроны...

Дарагая мая, я вельмі люблю жыцьцё. Вось толькі зло... яно павінна быць пакарана. І калі Лёсу заўгодна, каб прыладаю помсты быў я, мне застанецца стаць ёю.

Яшчэ паведамляю табе, мая карміная, што я выходжу з усіх саюзаў, асацыяцыяў, партый і хартый, у якія некалі быў запрошаны альбо ўступіў сам. Нарэшце я стаў дарослым.

**P.S.** Днямі атрымаў пісьмо з Бэрну. Брат мой па зброі піша, што папрасіў палітпрытулку ў Швайцарыі і цяпер разам з жонкай і сынам вучыць нямецкую мову.

## Ліст трэці. Дарога на «Тытанік»

When I shall come back is difficult to say*.

* Цяжка сказаць, калі я вярнуся (анг.)

Сёньня, мая разумнічка, я раскажу крыху пра нашага брата азюлянта, г.зн. таго, хто просіць прытулку ў чужой краіне, пакінуўшы сваю.

Уражаньняў, вядома, шмат, але зьдзівіла мяне на самым пачатку бежанскага шляху тое, што я пра яго нічога дагэтуль ня ведаў.

Думаю, ніхто не рызыкне абвергнуць тую думку, што Заходняя Эўропа і Скандынавія ў вачох грамадзянаў «трэцяга сьвету» і краін з так званай «эканомікай, што даганяе» (да апошніх варта аднесьці і Беларусь) выглядаюць калі і ня раем на зямлі, дык месцам, дзе можна схавацца ад войнаў і эканамічнага рэзруху. А паколькі чалавек — сысун, найменш прывязаны да пэўнага арэалу расьсяленьня, то і імкнецца ён туды, дзе ягонае выжываньне і распладненьне сустракае найменш перашкодаў.

Пасьля катастрофы 11 верасьня 2001 г. у ЗША мы раптам пачулі пра «залаты мільярд». Што ж гэта за зьвер такі? Ды ня што іншае, як той самы багатыр-«тытанік», пра які я ўзгадваў у папярэднім лісьце. Гэта сукупны вобраз цывілізаваных грамадзтваў, якія спажываюць ільвіную долю цывілізацыйных дабротаў (прадукту грамадзкай вытворчасьці). «Залаты мільярд» — экстэрытарыяльнае постдзяржаўнае ўтварэньне, якое ўсё больш і больш гермэтызуецца, хоць на словах заяўляе пра сваю адкрытасьць. Праўда, пакуль існуюць каналы легальнага пранікненьня ў цывілізацыю «Тытаніка», адзін зь якіх — сыстэма прыёму бежанцаў. Менавіта гэтай дарогай прыйшоў у Заходнюю Эўропу «трэці сьвет», які і ўзводзіць сёньня ў ейных гарадах мячэты і малітоўныя дамы экзатычных рэлігій, напаўняе вуліцы пахам бараніны і выцясьняе з мэню рэстаранаў традыцыйную сьвініну. Але перадусім ён старанна здойвае вымя эўрапейскага бюджэту...

**Працяг будзе.**

**«У Тануме напісаў і першы верш па-беларуску — пра нарвэскае мястэчка Сандвіку, дзе набываў я пачак цыгарэтаў даляраў за сем, дыхаў водарам восеньскага травастою ды любаваўся белагаловай малечай у нарвэскіх дварышчах».**



## • НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ •

**Беларуска-расейскі слоўнік:** У 3 т.: Больш за 110000 словаў. **Т. 1. А—З, Т. 2. З—П** / Ін-т мовазнаўства імя Я.Коласа НАН Беларусі; Пад рэд. А.Падлужнага. — 3-е выд. — Менск: БелЭн, 2003. 3000 ас.

Пабачылі сьвет два тамы з акадэмічнага трохтамовага «Беларуска-расейскага слоўніка», першае выданьне якога ў 1950-я рэдагаваў Кандрат Крапіва. «У апошнія гады *выстаўка* замененая *выставай*, *мерапрыемства* — *імпрэзай*, *чайнік* — *імбрыкам*. Аўтары, якія рыхтавалі слоўнік да друку, як правіла, падобныя лексычныя дублеты ў яго не ўключалі, бо іх ужываньне відавочна зьвязанае толькі з пэўнай групай карыстальнікаў літаратурнай мовай і яны нічым не адрозьніваюцца ад дзесяцігодзьдзямі замацаваных», — пазначана ў прадмове.

**Газэты Беларусі: 1776—1975 г.:** Бібліягр. паказьнік / Нац. кніжн. палата Беларусі. — Менск, 2003. 700 ас.

Цана ў кнігарнях 29020 руб.

**Гісторыя Беларусі ў кантэксьце эўрапейскай цывілізацыі:** Дапам. / У.Казьлякоў і інш.; Пад рэд. Л.Лойкі. — Менск, 2003. — 348 с. 4000 ас.

Прапанаваны аўтарамі інтэграваны курс падае беларускую мінуўшчыну ў сьвятле гісторыі эўрапейскай хрысьціянскай цывілізацыі. У «Акадэмкнізе» цана выданьня 7060 руб.

**Грэймас А. Пра багоў і людзей. У пошуках этнічнай памяці** / Пер. зь літ. С.Шупы. — Менск: Энцыкляпэдыкс, 2003. — 404 с. 1000 ас.

У кнізе сусьветна вядомага французскага лінгвіста й сэміётыка літоўскага паходжаньня рэканструюецца разбураны масіў міталягічных уяўленьняў літоўцаў. Гэтае грунтоўнае дасьледаваньне, безумоўна, шмат дасьць і для разуменьня беларускае традыцыйнае культуры. У «Акадэмкнізе», дзе манаграфія каштуе 12320 руб., кажуць, што асноўная частка накладу бракаваная й у продаж паступіць толькі каля 100 асобнікаў.

**Дубянецкі Э. Культуралёгія:** Энцыкл. даведнік. — Менск: БелЭн, 2003. — 384 с.: іл. 3000 ас.

Упершыню ў Беларусі выходзіць маштабнае даведкавае выданьне, якое больш як у 800 артыкулах асьвятляе розныя аспэкты тэорыі й гісторыі культуры, раскрывае асноўныя культуралягічныя паняткі ды тэрміны. Галоўная адметнасьць кнігі — сувязь усіх матэрыялаў зь Беларусяй. У кнігарнях даведнік каштуе каля 7000 руб.

**Івашка І. Згукі параненай мроі:** Другая кніга вершаў. — Менск: Беларускі кнігазбор, 2003. — 204 с. 300 ас.

Аўтар — журналіст і нястомны вандроўнік па Беларусі — уваскрашае сармацкія ідэалы й апявае колішнюю велічнасьць шляхецкіх маёнткаў.

**Менск. Плошча Перамогі** / Склад. В.Мішчанка. — Менск: Міжнародны цэнтар культуры кнігі, 2003. — 48 с.: іл. 1500 ас.

Кніга распачынае сэрыю «Помнік». У «Акадэмкнізе» каштуе 5850 руб.

**Ліндsuccessэр Р. Гісторыя і ўлада: Нацыятворчы працэс і гістарычная палітыка на Беларусі XIX—XX ст.** / Пер. зь ням. Л.Баршчэўскага; Нав. рэд. Г.Сагановіч. — Санкт-Пецярбург: «Невский проспект», 2003. — 540 с. — (Б-ка часопісу «Беларускі Гістарычны Агляд»)

Нямецкі дасьледчык падае погляд «збоку» на праблему ўзаемадачыненьняў гістарычнай навукі й палітыкі. Назвы разьдзелаў — «Нацыянальная сьвядомасьць і «беларуская місія», «Цэнтральная Эўропа: гісторыя як геапалітыка», «Літва й міт «залатога веку», «Западно-руссизм» і нацыянальная гісторыя», «Гісторыкі й партыя», «Партызанскі міф у гістарыяграфіі й літаратуры». Па-нямецку кніга пабачыла сьвет у Мюнхене ў 1999. Па-беларуску яе можна прыдбаць у шапіку Акадэміі навук. Цана 13200 руб.

**Плотнікаў Б. Беларускае слоўніцтва:** Вуч. дапам. / Акадэмія кіраваньня пры прэзыдэнту Рэсп. Беларусь. — Менск, 2003. — 136 с. 100 ас.

У выданьні пададзеныя прыклады слоўнікавых артыкулаў і характарыстыка ўсіх тыпаў слоўнікаў — перакладных, тлумачальных, тэрміналягічных, лінгвістычных, дыялектных, фразэалягічных. «Беларуска-расійскі слоўнік» Я.Станкевіча названы найбольш адметным і самым «беларускім» перакладным слоўнікам пасьляваеннага часу. Цана ў «Акадэмкнізе» — 10370 руб.

**Тацяна Вабішчэвіч**

## Раландас Паксас

**Над прэзыдэнтам Літвы Раландасам Паксасам** навісла пагроза імпічмэнту. Да кансэрватараў у гэтым далучыўся старшыня літоўскага Сойму і лідэр сацыял-лібэралаў Артурас Паўлаўскас. Ён абнародаваў дакумэнты, выяўленыя падчасператрусу ў офісе Юр'я Барысава — спонсара перадвыбарнай кампаніі прэзыдэнта Літвы (прэзыдэнцкае крэсла каштавала ўсяго 400 тыс. даляраў). Сярод іншага там быў знойдзены плян «Страказа». Яго мэта — разьдзьмуць скандал вакол палітыкаў з партыяў сацыял-дэмакратаў і сацыял-лібэралаў ды прывесьці лібэрал-дэмакратаў, ачоленых Паксасам, да перамогі на парлямэнцкіх выбарах наступнага году. Былі й расцэнкі: «малы» скандал каштаваў 35 тыс. даляраў, «вялікі» — 80 тыс. Алоізас Сакалас, старшыня камісіі Сойму па расьсьледаваньні сувязяў дарадцаў Паксаса з крымінальнымі групоўкамі і замежнымі спэцслужбамі, адкрыта называе Барысава агентам расейскіх спэцслужбаў. Для імпічмэнту прэзыдэнта патрэбныя 60% галасоў парлямэнтарыяў.

**Грузінскага калегу Паксаса Эдуарда Шэварднадзэ** пакуль так не прыціснула. У складанай гульні з удзелам Масквы і Вашынгтону (паказальны штрышок — дэманстранты ў Тбілісі пратэставалі супраць дагэтуль не абвешчаных вынікаў выбараў ня толькі каля Цэнтравыбаркаму, але і каля амэрыканскага пасольства) ён ня толькі ня страціў пасады, але і абвесьціў чарговага пераемніка — кіраўніка Аджарыі і прамаскоўскае партыі «Адраджэньне» Асалана Абашыдзэ. Папярэднімі былі Зураб Жванія і Ніно Бурджанадзэ.


REUTERS

**Ян Шадэк** прызначаны кіраваць адчыненым дыпляматычным прадстаўніцтвам Швэцыі ў Беларусі. Да пары да часу ён будзе там і адзіным дыпляматам. Пакуль гэта не пасольства, а толькі аддзяленьне пасольства ў Маскве (што выклікала неадкладную крытыку з боку Андрэя Саньнікава). Тым ня менш, гэта першае прадстаўніцтва скандынаўскае краіны.

**Язэп Турко ўрэшце звольнены** з пасады дырэктара дзяржаўнага сымфанічнага аркестру. Сярод прычынаў звальненьня — адмова Турка весьці ідэалягічную працу ў калектыве. Пастанову пра звальненьне Турко будзе абскарджваць у судзе.


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Генадзя Дашука, былога намесьніка старшыні суду Савецкага раёну Менску,** які ў свой час засудзіў «Нашу Ніву», будуць судзіць самога. Вінавацяць яго ў атрыманьні хабару. У прыватнасьці, паводле абвінавачаньня, восеньню 1995 г. Дашук атрымаў ад маці аднаго з падсудных 1,5 тысячы даляраў. У выніку падсуднаму было прызначанае пакараньне, «ніжэйшае за ніжнюю мяжу». Такіх эпізодаў некалькі. Цікава, што Дашук — сын аднаго з былых старшыняў Вярхоўнага Суду БССР.

## Джордж Сорас

**Мільярдэр Джордж Сорас** лічыць на сёньня адхіленьне Буша ад улады справай свайго жыцьця. Ён ужо выдаткаваў на мерапрыемствы, зьвязаныя з перадвыбарнай кампаніяй дэмакратаў, 15 млн даляраў, зьбіраецца даць яшчэ 75. Мільярдэр называе ЗША за Бушам «пагрозай для сьвету і міру». Ён не адзін такі, як паказала нядаўняе апытаньне эўрапейцаў. Але ўявіце, што было б з тым беларускім мільянэрам, які б публічна заявіў тое самае пра… Маўчым, маўчым.


OLD.ECHO.MSK.RU

## Юры Акімаў

**Юры Акімаў, кіраўнік «Вэлкаму»,** паплаціўся за невыкананьне пляну. Гэты топ-мэнэджэр-небарака сарваў праграму паскоранага разьвіцьця мабільнай сувязі на аўтамагістралях краіны. Акімаў не папрацаваў і году, тады як міністар сувязі Ўладзімер Ганчарэнка застаецца доўгажыхаром ураду. Паходжаньне з КДБ не дапамагае, калі справа ідзе пра дзяльбу зыску ад такога прыбытковага бізнэсу. Топ-мэнэджэры ў беларускім паўдзяржаўным бізнэсе — такія ж найміты, як і сакратаркі ў іхных кабінэтах. А сам «Вэлкам», у расплату за лішнюю самастойнасьць, атрымае трэцяга GSM-канкурэнта.

Дарэчы, Хадаркоўскі ў братняй Расеі ўсё сядзіць.

**За Аляксандра Глеба, паўабаронцу зборнай Беларусі** й нямецкага «Штутгарту», б'юцца прэстыжныя клюбы. Пацьвердзіліся зьвесткі пра тое, што яго спрабаваў «купіць» «Лівэрпуль». Раней Аляксандрам цікавіліся лёнданскі «Арсэнал» і мілянскі «Інтэр». Але Глеб з «Штутгарту» сыходзіць не зьбіраецца. Хіба што ў тэлезоркі — вунь у кліпе «Крамбамбулі» ўжо зьняўся.

## Працавіты прэм'ер

Тыдзень ляжаць у ложку — такі рэцэпт выпісалі дактары **прэм'еру карыбскага архіпэлягу Сэнт-Вінсэнт і Грэнадыны,** 56-гадоваму Ральфу Ганзалесу. Дыягназ — скрайняе зьнясіленьне. Прэм'ер прызнаецца, што апошнія тры месяцы ён па шаснаццаць гадзінаў у дзень вылічваў дзяржаўны бюджэт. Плошча яго краіны складае 389 кв.км, жыве там сто тысячаў чалавек.

**Сяргей Мікулевіч**

## ДЗЕ ВАРТА БЫЦЬ

### Вайцюшкевіч прэзэнтуе, Барадулін і Камоцкі падпяваюць

**21 лістапада ў Доме вэтэранаў** (вул.Янкі Купалы, 21) Зьміцер Вайцюшкевіч і «WZ-orkiestra» прэзэнтуюць новы альбом «Паравіны году». Чакаецца ўдзел Алеся Камоцкага, зь песьняў якога складаецца праграма, і Рыгора Барадуліна, якому песьні напросту спадабаліся. Вайцюшкевіч абяцае таксама згадаць сёе-тое з ранейшых праграмаў, абавязкова засьпяваць з заляй «Песьню няшчаснага казла» ды «Ўчора бабка». Пачатак а 19-й. Цэны на квіткі вагаюцца ад 6 да 9 тыс. руб.

### Менск, прастора, час

**Сяргей Кажамякін** стане нечаканым адкрыцьцём для аматараў візуальнай гісторыі Менску. Мэтар беларускай фатаграфіі дэманструе свае працы з экспазыцыі «Менск, прастора, час», якая прадстаўляла Беларусь у лёнданскім «Millennium Hous» у 2000 г. Выстава працуе ў гандлёва-выставачным цэнтры «Манэж» (вул.Кульман, 11) да 21 лістапада. Тым, хто жадае пабачыць поўную калекцыю «менскіх» здымкаў, раю наведаць асабістую старонку фатографа ў Інтэрнэце: http://kozhemyakin.dironweb.com.


(c)s.kozhemyakin

### Шалкевіч у Баранавічах

**18 лістапада, у аўторак, у малой залі баранавіцкага Дому афіцэраў** адбудзецца выступ гарадзенскага барда Віктара Шалкевіча. Запрасіла яго мясцовая рада ТБМ. Пачатак у 17:30. Запрашаюцца ўсе ахвотныя.

### Візы будуць таньнейшыя

**Пасьля канцэрту-прэзэнтацыі «Viza NRM» удзельнікаў праекту — усіх разам — можна будзе пабачыць яшчэ раз.** 15 лістапада а 17-й яны зьбяруцца ў новай музычнай краме «Music-city» (вул.Першамайская, 18), каб адказаць на пытаньні цікаўных ды раздаць аўтографы. У гэты дзень сьвежы альбом кавэраў «NRM» можна будзе набыць таньней.

### «На неба» за так

**15 лістапада Віталік «Артыст» з гурту «Безь Білета» нечаканым чынам адзначыць свой дзень народзінаў.** Аб 11-й каля Дому афіцэраў ён будзе раздаваць за так альбом «На неба». З тысячнага накладу дыску большую частку лідэр «ББ» ужо падараваў. І не таму, што дыск дрэнна прадаецца. Наадварот, паходжаньне дыскаў, якія даволі добра прадаюцца ў музычных крамах, самому Віталіку невядома — у продаж ён даваў усяго 150 асобнікаў.

### Леаніды вяртаюцца

**Зямля гэтымі днямі праходзіць праз дзьве вялікія мэтэарытныя плыні.** 12 лістапада мы мінулі Таўрыды, а ўначы 18 лістапада можна будзе ўбачыць славутыя Леаніды, увекавечаныя Караткевічам у рамане «Нельга забыць». Спачатку твор зваўся «Леаніды ня вернуцца да Зямлі», але за Брэжневым назву зьмянілі на больш «паліткарэктную». Леаніды будуць відаць толькі далёка ад гарадоў.

### Голас Гусоўскага

**19 лістапада а 17-й у Дзяржаўным музэі гісторыі беларускай літаратуры** (вул.Багдановіча, 13, Траецкае прадмесьце) адкрыецца выстава «Мікола Гусоўскі. Голас XVI ст.» (да 480-годзьдзя выданьня ў Кракаве «Песьні пра зубра»). Выстава распавядае аб гісторыі стварэньня і выданьня паэмы.

**Сяргей Будкін, АД, Руслан Равяка, МГ**

ЗАПРАШАЕМ
12–14 сьнежня
«Золота підкова» Львоўшчыны
Упершыню ў Беларусі — гістарычная экскурсія па **Львове** і шасьці навакольных замках (**Алеськ, Падгорцы, Залочыў, Крэхіў, Жоўква, Сьвірж**).
Два дні — начоўка ў гатэлі турклясы. Кошт — 45 у.а. (студэнтам — зьніжкі).
Плянуецца імпрэза ад Зьмітра Сасноўскага (гурт «Стары Ольса»).
Дакраніся да гісторыі!
Тэлефануйце: **222-88-61, 8-029-779-83-10.**
Заходзьце: вул.Фабрыцыюса, 9, пакой 13

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

Запрашаем на падарожжа 16 лістапада (нядзеля) па маршруце: Менск — Барысаў (крэпасьць) — Талачын — Чарэя — Белая Царква — Смаляны (замак, касьцёл) — Межава — Ворша — Менск.
Т.: 232-54-58; 8-029-622-57-20 (Зьміцер)
Т.: 264-12-38; 8-029-776-24-35 (Павал)

### ВІТАНЬНІ

**Кастуся Акулу** з народзінамі віншуюць землякі з Глыбоччыны! Хай Бог дае здароўя і сілаў.

**Віншую жонку** Марозаву Тоню з Днём народзінаў. Зычу добрага здароўя і цікавага жыцьця на кожны дзень. Віктар

**Рэчыцкія сябры** партыі БНФ віншуюць свайго старшыню Валера Пуціцкага з нараджэньнем маленькай беларусачкі

**Віншую** БДУ і ГДУ з Днём студэнта. Зычу бясхвостых сэсіяў. Жыве Беларусь! Сяргей

**Жэня**, калі адчуеш дакрананьне ветру — гэта мой пяшчотны пацалунак нагадвае пра мяне. Т.д. Юля

* * *

Больш не чытаю Табе вершаў,
Хаця часамі іх пішу.
Маім пачуцьцям мала межаў,
Аднак я слоў каханьня не кажу.

Надзею выдаюць мо толькі вочы,
І іхняй праўды ні стрымаць.

У вернасьці я прысягнуў аднойчы
І сэрца — не пашкадаваў аддаць.

Цяпер баюся чытаць Табе вершы.
І словы каханьня баюся казаць.
…Восень! Дзьве тысячы першы!
Мне страшна, што было, ўзгадаць!..

Сяржук Бахун

### КАНТАКТЫ

**Патрэбна дапамога** ў вывучэньні літоўскай мовы. Т.: 274-97-41

**610-ы**, чакайце гасьцей зь беларускіх абласьцей. Рыхтуйце гарбату. Беларусь переможа, бо мы разам. Сяргей

**Прыму** ў падарунак аўдыёкасэты гурту «Мроя» 1987—92 г. Т.: 244-13-70

### КНІГІ, МУЗЫКА

**Прадаю** кнігу Васіля Быкава «Доўгая дарога дадому». Т. (у Гомелі): 45-11-51. Velcom (толькі SMS): 632-88-52

**Куплю** касэты : «NRM», «Zet», «J-mors», «Палац», «Крама», «Імпэт», «БН», «IQ-48», «Крыві», «Уліс», «Плян». Т.: 245-17-37. Раман

**Куплю** «Памяць. Ельскі раён». Т.: (01771) 5-78-95 (пасьля 18-й). Сяргей

### ПРАЦА

**Якасна** выканаю пісьмовыя працы па беларускай гісторыі, літаратуры і мове. Магчыма рэпэтытарства. Т.: 235-18-72 (пасьля 16.00)

Наша Ніва КУПОН БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБВЕСТКІ

Запоўніце гэты купон, і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна. А/с 537, 220050, Менск.

**Тэкст** ____________________

**Імя і прозьвішча** ____________________

**Адрас, тэлефон** ____________________

**Наша Ніва**
незалежная газэта
заснаваная ў 1906, аднаўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| галоўны рэдактар | Андрэй Дынько |
| выпускны рэдактар | Арцём Лява |
| карэктар | Сяргей Петрыкевіч |
| карэктарка | Галіна Рабянкова |
| нам. галоўнага рэдактара | Андрэй Скурко |
| тэхнічны рэдактар | Андрэй Чык |
| выдавец і заснавальнік | Фонд выданьня газэты «Наша Ніва» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**
© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 8 палос фарматам А2, 4 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск код 764.
Наклад 3429. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 22.00 12.11.2003.
Замова № 6023.
Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а